ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 219 (3327) Серада 25-га верасьня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—731

РАДЫЕ у ГАДЗ. НОЧЫ:

ВАРШАВА, 24. У Віленскім акруговым судзе пачалася адна з шматлікіх спраў супроць лідэра беларускай грамады, былага дэпутата сойму, Тарашкевіча, які быў дастаўлены на працэс з турмы Вронкі.

АПОШНІЯ НАВІНЫ **Б. С. С. Р.**

З прычыны слабасьці мясцовых бюджэтаў Беларусі Саюзны Савет Народных Камісараў прызнаў неабходным фінансаваць народную асьвету ў БССР за кошт агульнасаюзных сродкаў.

Сёньня, 25 верасьня, роўна а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканьні кіно „КУЛЬТУРА“

АДБУДЗЕЦЦА

ЎРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ ПЛЕНУМУ МЕНГАРСАВЕТУ

сумесна з членамі ЦК КП(б)Б, ЦКК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, ЦВК, СНК, ЦСПСБ, АК КП(б)Б, АКК КП(б)Б, АК ЛКСМ, АВК, прадстаўнікамі камандна-палітычнага і чырвонаармейскага складу гарнізону, прымацаванымі да гарсавету дэлегаткамі і рабочымі прадпрыемстваў гораду.

Парадак дня

Доклад Наркамваенмора тав. ВАРАШЫЛАВА аб міжнародным і ўнутранным становішчы.

УВАХОД У ПАМЯШКАНЬНЕ: члены і кандыдаты гарсавету—па мандатах гарсавету, члены ЦК КП(б)Б, ЦКК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, прэзыдыуму ЦВК, СНК, ЦСПСБ, АК КП(б)Б, АКК КП(б)Б, АК ЛКСМ, АВК—па сваіх мандатах, дэлегаткі і прымацаваныя па дэлегацкіх кніжках, выданых гарсаветам, рабочыя і служачыя, камскład гарнізону і чырвонаармейцы па білетах, распаўсюджаных праз саюзы і начальніка гарнізону.

МЫ ПРАВОДЗІМ МАНЭЎРЫ З ТЭЙ-ЖА МЭТАЙ, З ЯКОЙ РАЗГОРТВАЕМ І САЦБУДАЎНІЦТВА

Радасьці, посьпехі і няўдачы Чырвонай арміі—ёсьць посьпехі і няўдачы ўсіх працоўных

Выступленьне Наркамваенмора тав. ВАРАШЫЛАВА на пленуме Бабруйскага гарсавету

21-га верасьня на пашыраным пленуме Бабруйскага гарсавету з удзелам партыйнага, камсамольскага і прафэсыянальнага актыву з двохгадзінным дакладам аб міжнародным і ўнутраным становішчы і аб ходзе манэўраў выступіў наркамваенмор тав. Варашылаў.

— Ад імя Рэвалюцыйнага ваеннага савету СССР і ад імя байцоў і начскладу часьцей, што бяруць удзел у манэўрах на тэрыторыі Бабруйскай акругі,—сказаў тав. Варашылаў,—перадаю палкае таварыскае прывітаньне працоўным Бабруйшчыны, якія шмат зрабілі для таго, каб манэўры праходзілі пасьпяхова і далі тыя вынікі, якія мы ад іх чакаем.

— Мы з году ў год,—гаворыць тав. Варашылаў, — праводзім манэўры на якіх падагульваем вынікі нашай вучобы, рост нашых тэхнічных сродкаў і рост палітычнай сьвядомасьці байцоў. Такія-ж манэўры праводзяць і нашы суседзі. Але нашы манэўры адрозьніваюцца тым, што яны праходзяць у іншых абставінах. Нашы манэўры—справа ўсіх працоўных. Радасьці, посьпехі і няўдачы Чырвонай арміі—ёсьць посьпехі і няўдачы ўсіх працоўных. Нашы радасьці і няўдачы блізкі масам, як блізкі і самі нашы байцы. У буржуазных краінах працоўныя глядзяць на армію, як на армію ўціску іх імкненьняў.

Зусім іншае мы бачым у нас.

Мы праводзім манэўры з тэй-жа мэтай, з якой разгортваем і сацыялістычнае будаўніцтва. Будаўніцтва і абарона яго шчыльна ўвязаны.

Армія наша з году ў год зьмяняе свой выгляд. У гэтым годзе мы бачым, што мы сапраўды навучылі ваенной справе байцоў. Дасягненьні нашы вялікія.

Грамадзянскія арганізацыі побач з дасягненьнямі часамі яшчэ выяўляюць у рабоце невыстарчальную выразнасьць, невыстарчальную акуратнасьць. А трэба не забываць, што ўзьняцьце тэмпу і якасьці работы—наша агульная неадкладная задача.

Тая ўвага, якую працоўныя Бабруйшчыны праявілі ў гэтыя дні ў адносінах да Чырвонай арміі—не пазінна зьмяншацца ніколі.

Тэхнічная моц нашай Чырвонай арміі цесна і непарыўна зьвязана з эканамічным ростам краіны. А такога тэмпу эканамічнага росту, як у нас, ня мае ніводная краіна. Тэмп нашага росту—нябачны ў гісторыі, і ў гэтым зарука нашай магутнасьці і сілы.

Нас палохалі, што ў бюджэце гэтага году мы будзем мець прарыў. Між тым, практычная работа паказвае, што мы выконваем наш бюджэт не з прарывамі, а з перавышэньнем. Гэта сьведчыць аб тым, наколькі вялікія сілы мільённых мас працоўных, энэргія якіх перамагае вялізарныя труднасьці, што стаяць на шляху нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Лічбы, узятыя з паасобных галін нашага будаўніцтва, паказваюць нам, што пяцігадовы плян мы здолеем выканаць ня больш, як у чатыры гады. Аб тых магчымасьцях, якія мы маем, сьведчыць хаця-б той факт, што раней Пуцілаўскі завод даваў 900 трактараў у год, а цяпер ён будзе даваць іх 10.000.

У пэрыяд вялікага напружаньня для выкананьня пляну вялікіх работ, нам трэба больш чым калі-б там ні было быць бадзёрымі і маналітнымі. Вось чаму наша партыя так бязьлітасна змагаецца з усімі ўхіламі, з усімі тымі, хто хоча пахіснуць нашы рады. Перад рабочай клясай стаіць задача разгортваньня далейшага пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва, што магчыма толькі пры мабілізацыі ўсіх сіл працоўных, узмацненьні працоўнай дысцыпліны і ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы, паляпшэньні якасьці прадукцыі. Задачы сацыялістычнага будаўніцтва мы бязумоўна здолеем выканаць у вызначаныя тэрміны пры ўмове, калі на нас не нападуць. А калі і нападуць, дык мы здолеем даць самы рашучы адпор.

Гаворачы аб міжнародным становішчы т. Варашылаў адзначае:

— На Далёкім Усходзе кітайская ваеншчына імкнецца нас справакаваць. Але мы ня страцім спакою духу. Мы да правакацый прызвычаены. Усе замахі кітайскіх генэралаў мы адсячэм, іх напад на нашу краіну адаб'ем.

За сьпіной кітайскіх генэралаў стаіць сусьветная буржуазія. Яна хоча паставіць перагародку паміж Савецкім Саюзам і 400 мільёнамі кітайскіх працоўных. Вось чаму, яна імкнецца нацкаваць на нас кітайскую ваеншчыну.

Далей тав. Варашылаў спыніўся на нашых узаемаадносінах з Англіяй і на ролі «рабочага» ўраду ў пытаньні адналёньня англа-савецкіх адносін. Нарэшце тав. Варашылаў заклікаў працоўных Бабруйшчыны, над кіраўніцтвам УсеКП(б), не пакладаючы рук працаваць над умацаваньнем пазыцый сацыялістычнага будаўніцтва і выкананьнем пяцігодкі, ні на хвіліну не забываючы ў штодзённай працы клопатаў аб абароне Савецкага Саюзу.

Пасьля дакладу выступалі камандуючы ВВА т. Ягораў, Міх. Кальцоў і рад рабочых бабруйскіх прадпрыемстваў, якія запэўнілі, што пралетары Бабруйску, працуючы ля варштату, выканаюць усе ўскладзеныя на іх задачы па будаўніцтву.

Даклад т. Варашылава перадаваўся праз гучнагаварыцель на вуліцы. Пасьля выхаду т. Варашылава з клюбу, яго спаткалі гучным «ура» і наладзілі яму бурную авацыю.

Адозва тав. ВАРАШЫЛАВА

ДА УСІХ ПАРТЫЙНЫХ, ПРАФСАЮЗНЫХ І САВЕЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ БССР

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Пасьпяхова закончыўшыяся Бабруйскія манэўры паказалі глыбокую аддаднасьць рабочае клясы і працоўных мас сялянства Беларусі справе ўзмацненьня абароны Савецкага Саюзу і павышэньня баяздольнасьці Чырвонай Арміі.

Манэўруючыя часьці Чырвонай Арміі сустракалі, як у горадзе, так і ў вёсцы, шчырыя адносіны і брацкую дапамогу з боку працоўных, а таксама—з боку мясцовых партыйных, прафсаюзных і савецкіх арганізацый.

Кіруючыя партыйныя, прафсаюзныя і савецкія органы Беларусі прарабілі вялізную работу па падгатоўцы да манэўраў. Глыбокая палітычная сьвядомасьць, праяўленая працоўнымі Беларусі ў адносінах да манэўраў, сьведчыць аб вялікай увазе з боку ЦК КП(б)Б, ЦСПСБ, ЦВК і СНК Беларусі да пытаньняў абароны Савецкага Саюзу і будаўніцтва ўзброеных сіл нашай краіны. Заслугоўвае асобнай увагі ў гэтых адносінах работа кіруючых арганізацый Бабруйскай акругі.

Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Рэвалюцыйны Ваенны Савет СССР вітае ЦК КП(б)Б, ЦСПСБ, ЦВК і СНК Беларусі і выражае сваю глыбокую падзяку працоўнаму насельніцтву Беларусі і ўсім партыйным, прафсаюзным і грамадзкім арганізацыям за праробленую працу.

Чырвоная Армія цьвёрда ўпэўнена, што Савецкая Беларусь, якая знаходзіцца на мяжы капіталістычнага міру, заўсёды застанецца верным і стойкім вартаўнічым Савецкага Саюзу.

Няхай жыве камуністычная партыя Беларусі!

Няхай жыве Савецкая Беларусь!

Няхай мацнее абарона Савецкага Саюзу!

НАРОДНЫ КАМІСАР ПА ВАЙСКОВЫХ І МАРСКІХ СПРАВАХ І СТАРШЫНЯ РВС СССР
ВАРАШЫЛАЎ.

ДА РАБОЧЫХ і СЯЛЯН САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

ТАВАРЫШЫ РАБОЧЫЯ І СЯЛЯНЕ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ!

У напружанай міжнароднай абстаноўцы Чырвоная Армія праводзіла ў гэтым годзе сваю баявую падрыхтоўку.

Пагроза новага нападу капіталістычнага сьвету на Савецкі Саюз, пагроза новых імпэрыялістычных войнаў узрастае з кожным годам. Сусьветны капітал, як і раней, робіць шапёную працу па абкружэньні пралетарскае дзяржавы. На Далёкім Усходзе па указцы імпэрыялістычных дзяржаў захоплена Кітайска-Усходняя чыгунка, кітайскія мілітарыстыя бязупынна правакуюць нас на вайну. Савецкі ўрад не паддаецца на правакацыю імпэрыялістых. Ён і зараз працягвае цьвёрда і няўхільна праводзіць палітыку міру. Аднак мы прасякаем і будзем прасякаць узброеную рукой усякія спробы сусьветнага імпэрыялізму парушыць недатычнасьць савецкіх межаў. Чырвоная Армія гатова да абароны Савецкага Саюзу, зможа даць рашучы адпор тым, хто спрабуе парушыць цэльнасьць пралетарскае дзяржавы.

Абарону Кастрычнікавых заваёваў забясьпечвае ня толькі сьвядомая, дысцыплінаваная, добра вывучаная Чырвоная Армія, але і падтрыманьне абароны СССР з боку ўсіх працоўных. У рабочае клясы, бядняцка-серадняцкіх мас сялянства Чырвоная Армія мела будзе мець невычарпальныя рэзэрвы і сталую дапамогу будаўніцтву ўзброеных сіл. Рыхтуючыся абараняць пралетарскую дзяржаву ад нападу сусьветных імпэрыялістых, Чырваная Армія дамаглася раду посьпехаў у сваёй баявой падрыхтоўцы. Бабруйскія манэўры, якія толькі што пасьпешна скончыліся, сьведчаць аб далейшым росьце баявой падрыхтоўкі нашых узброеных сіл. Чырвонаармейцы добра ведалі свае абавязкі. Камандзіры, палітработнікі паказалі значныя посьпехі ў кіраваньні часьцямі пры складных варунках сучаснага бою. Бабруйскія манэўры адначасна сьведчаць аб рашучым узросьце, тэхнічнай моцы Чырвонае Арміі.

Палітычную сьвядомасьць, разуменьне сваіх задач, як байцоў Чырвонае Арміі, будаўнікоў сацыялізму ўвесь асабовы склад манэўруючых часьцей найбольш яскрава выказаў пры спатканьні з працоўным насельніцтвам Беларусі. Партыйнымі арганізацыямі дадатна праведзена ў горадзе і на вёсцы сур'ёзная праца па прапагандзе генэральнай лініі партыі. Яшчэ больш узмацнілася братэрская сувязь і ўзаемнае даверра паміж Чырвонай Арміяй і працоўнымі раёну манэўраў.

Увагаю і каханьнем абкружылі рабочыя сяляне чырвонаармейцаў і начскład. Вайсковыя часткі ўсюды спатыкалі самы братэрскі прыём. З выключным энтузіязмам віталі армію працоўныя Бабруйска і ваколічных вёсак. Бабруйскія манэўры яшчэ раз сьцьвердзілі, што Чырвоная Армія зьяўляецца каханым дзіцём рабочае клясы працоўнага сялянства. Партыйная і савецкая грамадзкасьць Чырвонай Беларусі многа дапамагла манэўруючым часткам. Арганізацыі камуністычнае партыі разгарнулі сярод рабочых і працоўных вялікую працу па вытлумачэньню задач манэўраў. Чырвоныя чыгуначнікі сваёй упартай працай забясьпечылі пасьпяховы рух войскаў, сваячасова дастарчаючы ім патрэбнае.

Побач з гэтым савецкі апарат прыняў усе меры да нармальнага перасоўваньня войск па шасэйных і грантавых шляхох. Добра нападжаная праца беларускіх органаў спажывецкай і сельскагаспадарчай каапэрацыі была важнейшым варункам забясьпячэньня войска ўсім патрэбным. С поўнымі ведамі сваёй справы, з вялікім энтузіязмам працавалі арганізацыі беларускага Чырвонага Крыжа. Тысячы членаў Асоавіяхіму прынялі непасрэдны ўдзел у складзе манэўруючых частак, як вайсковыя адзінкі.

Ад імя рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі Рэвалюцыйны Ваенны Савет Саюзу ССР выказвае гарачую падзяку ўсяму працоўнаму насельніцтву Беларусі.

Таварышы рабочыя і сяляне!

Нашы посьпехі ў галіне будаўніцтва ўзброеных сіл відавочны, але яны яшчэ не дастатковы. Ворагі краіны пралетарскае дыктатуры ўзброены да зубоў. Яны поўны ненавісьцю да нашае рабочае дзяржавы. Таму, не пакладаючы рук, будзем працаваць над далейшым умацаваньнем магутнасьці Чырвонае Арміі.

Усе сілы на зьдзейсьненьне пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва, які падводзіць магутны фундамант пад абарону краіны. Даб'емся павялічэньня вытворчасьці працы, узвышэньня якасьці работы, зьніжэньня сабекошту прадукцыі. Разгорнем ва ўсю шырыню будаўніцтва сацыялістычных формаў сельскае гаспадаркі. Будзем весьці ўпартую барацьбу з кулакамі, якія перашкаджаюць пераможнаму будаўніцтву сацыялізму. Усё гэта будзе гіганцкі ўмацоўваць абароназдольнасьць Савецкага Саюзу, створыць усе неабходныя ўмовы для далейшага ўмацаваньня ўзброеных сіл пралетарскае дыктатуры.

Няхай жывуць працоўныя Савецкай Беларусі.

Няхай жыве камуністычная партыя.

Няхай жыве Чырвоная Армія—надзейны вартаўнік сацыялістычнага будаўніцтва.

НАРОДНЫ КАМІСАР ПА ВАЙСКОВЫХ І МАРСКІХ СПРАВАХ І СТАРШЫНЯ РВС САЮЗУ ССР
ВАРАШЫЛАЎ.

Сьмялей і энэргічней з падрыхтоўкаю і пераходам на бесьперапынную вытворчасьць

Бюро ЦК КП(б)Б гэтымі днямі заслухала даклад аб ходзе практычнай работы па падрыхтоўцы да пераводу нашых прадпрыемстваў на бесьперапынную вытворчасьць.

Бюро ЦК прызнала, што гэта падрыхтоўка праходзіць вельмі пездавальняючым тэмпам.

ВСНГБ ня мае канкрэтнага пляну пераводу сваіх прадпрыемстваў на бесьперапынную вытворчасьць. У выніку гэтага, а таксама іншых прычын, не разгорнута падрыхтоўка і ў адносінах прыстасаваньня ўстаноў культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых прадпрыемстваў, якія пяройдуць на бесьперапынную вытворчасьць. Між тым, пытаньне аб пераходзе на бесьперапынную вытворчасьць мае буйнейшае значэньне для нашай прамысловасьці і ўсёй народнай гаспадаркі. Тав. Молатаў у сваім нядаўнім дакладзе на Маскоўскай абласной канфэрэнцыі так характарызуе значэньне пераходу на бесьперапынную вытворчасьць:

«У пытаньні аб ажыцьцяўленьні лёзунгу «дагнаць і перагнаць» капіталістычныя краіны мы за апошні час зрабілі яшчэ адзін вельмі буйны крок. Пастанова аб пераходзе на бесьперапынную вытворчасьць мае ў гэтых адносінах вялізнае значэньне. Гэта мерапрыемства дасьць СССР вялізную перавагу ў справе паскарэньня гаспадарчага разьвіцьця, ствараючы для разьвіцьця нашай прамысловасьці такія спрыяючыя ўмовы, якіх капіталістычныя краіны ня маюць і мець ня могуць».

Апошні пленум ЦК КП(б)Б у сваіх пастановах таксама запісаў:

«Важнейшую ролю ў справе ўзмацненьня тэмпу індустрыялізацыі і выкананьня напружаных пляноў усяго гаспадарчага будаўніцтва павінна адыграць устанаўленьне бесьперапыннай вытворчасьці. Выходзячы з таго, што да гэтага часу яшчэ ня зусім поўна распрацавана пытаньне аб увядзеньні бесьперапыннага вытворчага тыдню ў прамысловасьці БССР, прызнаць неабходным у бліжэйшы час поўную распрацоўку данага пытаньня і правядзеньне яго ў жыцьцё».

Гээта пастанова абавязвае ўсіх нас, і ў першую чаргу гаспадарчыя органы, у шмат разоў больш энэргічна, як да гэтага часу, узяцца за **практычную падрыхтоўку** да пераходу на непарыўную вытворчасьць.

Тым больш гэта неабходна, што сама задача пераходу прадстаўляецца даволі цяжкай і складанай.

Як і ўсякае складанае мерапрыемства, пераход на бесьперапынную вытворчасьць будзе ажыцьцёўлен тым хутчэй і лягчэй, чым шырэй і бліжэй у яго вырашэньні прымуць удзел рабочыя масы.

У сваёй пастанове Бюро ЦК запісала, як абавязковую ўмову посьпеху ўсяе справы—прыцягненьне да распрацоўкі пляну пераходу на бесьперапынную вытворчасьць прафсаюзаў і шырокіх рабочых мас.

Вытворчыя ячэйкі КП(б)Б, прафсаюзныя арганізацыі зьверху да нізу, гаспадарчыя арганізацыі, вытворчыя нарады і камісіі павінны ва ўсю шырыню і практычна паставіць пытаньні аб пераводзе данага прадпрыемства на бесьперапынны тыдзень. Толькі пры такім узгодненым дзеяньні будуць улічаны ўсе акалічнасьці работы ў новых умовах, будзе да гэтых умоў поўнасьцю прыстасавана культурна-бытавое абслугоўваньне рабочых.

Трэба сьмела і энэргічна ставіць пытаньні, зьвязаныя з пераходам на бесьперапынную вытворчасьць, дабіваючыся хутчэйшага і поўнага правядзеньня ў жыцьцё гэтае важнейшае пастановы партыі.

УССР—культурны асяродак усяе Украіны

ДАКЛАД ТАВ. СКРЫПНІКА ў ЛЬВОВЕ

Наркамасьветы УССР тав. Скрыпнік, знаходзячыся праездам у Польшчы, зрабіў у Львове даклад на пленуме сэкцыі навуковага таварыства імя Шаўчэнкі. Тэмаю дакладу было становішча і пэрспэктывы культурнага будаўніцтва УССР. Даклад зрабіў вялікае ўражаньне. Скрыпнік скончыў даклад паказаньнем, што ў свой час Галіцыя адыграла ролю культурнага пьемонта, да якога прыслухоўвалася ўся вялікая Украіна. Цяпер становішча стала дыямэтральна процілеглым. Даклад быў накрыты доўгімі аплёдысмэнтамі.

Ад імя таварыства Скрыпніка віталі намесьнік старшыні Ракоўскі і Цыгельскі (старшыня прафэсар Студніцкі знаходзіцца за мяжою).

Ва ўсіх украінскіх газэтах апублікавана інтэрв'ю, данае Скрыпнікам львоўскім журналістым. Увесь украінскі друк падкрэсьлівае посьпех Скрыпніка. Гэта акалічнасьць зьявілася для польскіх газэт прычынаю да адкрытых выпадаў супроць Скрыпніка.

Выпады польскай прэсы супроць т. Скрыпніка

ВАРШАВА, 21. У сувязі з пабытам у Польшчы Наркома асьветы УССР тав. Скрыпніка ў польскім друку зьявіўся артыкул, у якім зьмешчаны рад рэзкіх выпадаў супроць яго. У гэтым артыкуле тав. Скрыпнік называецца арганізатарам ЧК, абвінавачваецца ў расстрэлах украінскай інтэлігэнцыі, у вынаньні украінскіх вучоных з Украінскае акадэміі навук. «Цяпер, кажа артыкул, Скрыпнік прыехаў у Львоў, каб унесьці камуністычны дух у украінскі асяродак ва Ўсходняй Малой Польшчы».

«Экспрэс Паранны» зьмясьціў гэты артыкул пад загалоўкам «Правакацыйныя выступленьні чэкістага ў Львове». Афіцыёзная газэта «Эпоха» таксама надрукавала цалкам гэты наяўна інсьпіраваны артыкул.

Паўстаньне супроць Чан Кай-шы пашыраецца

Вайсковыя дзеячы Кітаю патрабуюць перадачы ўлады Ван Цін-вэю

Абстрэл нашых часьцей

ЧЫТА, 23. Зноў адзначаюцца выпадкі абстрэлаў кітайскімі вэйскамі нашых пагранічнікаў. 21-га верасьня ў раёне разьезду 86 наша пагранічная застава была нечакана абстрэляна з кітайскага боку залпамі з вінтовак і кулямётным агнём. Сёньня кітайскія салдаты зноў пачалі абстрэльваць нашых пагранічнікаў з кулямётаў і вінтовак. Пасьля нашага агню ў адказ кітайцы спынілі абстрэл.

***

ХАБАРАЎСК, 23. Сёньня кітайскія салдаты ў раёне Ільліга (40 кілёмэтраў на паўночны-захад ад Хабараўска) абстрэлялі нашыя параходы. Пасьля нашага адказу агнём кітайцы спынілі абстрэл.

Напад белагвардзейскіх банд

УЛАДЫВАСТОК, 23. За апошнія дні пачалі зьяўляцца з кітайскага боку новыя белагвардзейскія банды. 21-га верасьня на паўночны ўсход ад вёскі Спаскай зьявілася белая банда. У раёне Харэль (705 кілёмэтраў на поўнач ад Нікольска-Ўсурыйску) зьявілася новая значная белая банда. Абедзьве банды рабуюць і забіваюць мірнае насельніцтва. Намі ўжыты меры да ліквідацыі гэтых банд.

Белагвардзейская сволач заварушылася

ПРАГА, 19. Орган кампартыі «Рудэ-Право» паведамляе пра ўзмоцненую дзейнасьць белагвардзейцай у сувязі з падзеямі на савецка-кітайскай мяжы. Паводле вестак газэты ў апошні час у Празе і радзе іншых гарадоў Чэха-славакіі адбыўся рад сакрэтных нарад, на якіх разглядалася пытаньне аб арганізацыі вайсковых часьцей з белаэмігрантаў, што знаходзяцца на тэрыторыі Чэха-славакіі.

Правал кітайскай дыпліматы ў Жэнэве

ЖЭНЭВА, 21. Кітайцы паранейшаму абіваюць парогі вялікіх дзяржаў, высьвятляючы магчымасьці звароту ў раду Лігі па пытаньні аб канфлікце з СССР. Аднак, нават французкія дарадчыкі У Чжао-чу паказваюць яму, што з фармальнага звароту ў раду нічога ня выйдзе. На нарадах кітайцаў з некаторымі дзеячамі, выдатная роля якіх ў анкладная вядома, выпрацоўваецца форма «інфармацыйнага звароту» кітайцаў да Лігі. У Чжао-чу намераны падаць гісторыю канфлікту, а таксама зьвярнуць увагу Лігі на мнімыя напады савецкіх войск на кітайскую тэрыторыю і праследваньні кітайцаў у СССР.

Покуль, што кітайцы разаслалі ўсім дэлегацыям дэкларацыю выканкому Эўрапэйскае канфэдэрацыі Гаміндану «аб сапраўдных прычынах Савецка-Кітайскага канфлікту». Дэкларацыя пабудавана на самай бессаромлівай хлусьні.

Прапановы аб перагляндзе няроўнапраўных дагавораў зусім пахавана

ЖЭНЭВА, 23. У выніку з пасяджэньняў спэцыяльнае падкамісіі кітайская прапанова аб дастасаваньні 1-га артыкулу статуту Лігі Нацый з мэтаю дасягнуць перагляду няроўнапраўных дагавораў, зусім пахавана. Ніякіх новых момантаў, якія-б палягчалі перагляд дагавораў, прынятая рэзалюцыя ня ўносіць. Ніхто не аказаў Кітаю сапраўднага падтрыманьня ў гэтым пытаньні.

ШАНХАЙ, 23. Паведамленьне пра паўстаньні Чан Фа-Гуя супроць Чан Кай-шы пацьвярджаюцца. Армія, якая знаходзіцца ва Учане, атрымаўшы загад перайсьці ў раён Луханскай чыгункі, адмовілася падпарадкавацца і накіравалася не ў правінцыю Хэнань, а ў правінцыю Хунань. Чан Фа-Гуй апублікаваў адозву супроць Нанкіну, якую падпісалі многія вайсковыя дзеячы.

***

ТОКІЁ, 23. Як падаюць газэты, Ен Сішан, Фын Юй-сян, Тан Шэн-чы, Чу Пэйдэ і Чжан Фа-гуй патрабуюць, каб на чале цэнтральнага ўраду быў пастаўлены Ван-Цзін-вэй. Яны, між іншым, абвінавачваюць нанкінскі ўрад у тым, што канфліктам з СССР ён пагоршыў міжнароднае становішча Кітаю.

Аўстрыйскія фашыстыя рыхтуюцца да перавароту

29 верасьня назначана 4 вялікія дэманстрацыя хэймвэру

ВЕНА, 23. Паводле вестак газэт, паліцыя дзейна рыхтуецца да 29-га верасьня. На гэты дзень прызначаны 4 вялікія дэманстрацыі хэймвэру ў Ніжняй Аўстрыі. Сацыял-дэмакраты таксама назначылі на 28-га і 29-га верасьня каля 700 сходаў па ўсёй Ніжняй Аўстрыі. Паліцыя непакоіцца, што могуць адбыцца сутычкі. «Арбэйтэр Цэйтунг» публікуе адозву сацыял-дэмакратаў, у якой заклікае рабочых «пакінуць бяз увагі дэманстрацыю хэймвэру і захоўваць суровую дысцыпліну, прытрымліваюцца лёзунгаў супроць фашызму, супроць грамадзянскай вайны, за дэмакратыю, за рэспубліку, за мірнае эканамічнае будаўніцтва».

Сялянскі кулацкі саюз патрабуе аднаўленьня кары сьмерцю

ВЕНА, 23. Тут адбыўся мітынг дэлегатаў Ніжня-Аўстрыйскага сялянскага саюзу. На мітынгу прысутнічалі саюзны канцлер Штрэрувіц і некаторыя міністры. Ухваленая рэзалюцыя выказвае, з аднаго боку, давер'е габінэту Штрэрувіца, а з другога—салідарнасьць з хэймвэрамі.

Далей рэзалюцыя сьцьвярджае далучэньне сялянскага саюзу да хэймвэру і выказваецца за палітычныя патрабаваньні хэймвэру і прапанае весьці барацьбу за іх ажыцьцяўленьне парляманцкім шляхам. Матывуючы рэзалюцыю, старшыня падкрэсьліў, што сялянскі саюз патрабуе аднаўленьня кары сьмерцю. Ня гледзячы на ўхвалу рэзалюцыі друк працягвае пашырэць чуткі пра скорую адстаўку Штрэрувіца і аб утварэньні ўраду «моцнае рукі».

Заява галоўнага кіраўніка хэймвэру

ВЕНА, 23. У цэнтры Вены адбыўся сход хэймвэру, у якім прымала ўдзел 5 тысяч чалавек. Кіраўнік венскага хэймвэру Піхль заявіў, што хэймвэр не паложыць зброі, покуль канстытуцыя ня будзе грунтоўна зьменена. Галоўны кіраўнік хэймвэру Штэгдле заявіў: «зьніжчыўшы бальшавіцкае вогнішча ў Сярэдняй Эўропе, мы выканаем свой абавязак, ня толькі перад бацькаўшчынаю, але выканаем задачу, якая стаіць перад усёй Эўропай. За граніцаю будуць задаволены аднаўленьнем ва ўсёй Аўстрыі ўлады, якая будзе выклікаць на сябе пашану».

6-ты ўсесаюзны зьезд плянавых работнікаў

Выступленьне т. Кржыжаноўскага

МАСКВА, 23. Адкрыўся 6-ты ўсесаюзны зьезд плянавых работнікаў. Выступіў з вялікай прамовай **т. Г. Н. Кржыжаноўскі.**

«Наступны год,—сказаў т. Кржыжаноўскі,—зьяўляецца другім і адказьнейшым годам пяцігодкі. Пасьпяховае выкананьне народна-гаспадарчай праграмы ў 1929-30 годзе стварае цьвёрдую базу для далейшага прасоўваньня наперад. Нашы ворагі гавораць, што мы ствараем некаторы міраж, што, ня гледзячы на дасягненьні, якія яны ставяць у дужкі, у нашай краіне адбываецца яўная дэградацыя, якая намі ня ўспрыймаецца.

Тав. Кржыжаноўскі адхіляе выдумкі нашых ворагаў наступнымі фактамі. У СССР у 1928-29 годзе лічылася на 82,4 мільёны душ у рабочым узросьце 82,2 мільярды рублёў у асноўным і зваротным фондах краіны, што дае ў сярэднім па адной тысячы рублёў на работніка. Гадавы натуральны прырост ліку такіх работнікаў вызначаецца ў 1,8 мільёнаў чалавек. Значыць, укладаньні ў асноўныя і зваротны фонды павінны паводле гэтага разьліку скласьці ня менш 1 мільярду 800 мільёнаў у год. У наступным 1929-30 г. намячаецца павышэньне вытворчых фондаў на 6 мільярдаў рублёў, г. зн. мы ў тры разы перавышаем і норму, якая забясьпечыла-б стабільнасьць энэргаўзбраеньня кожнага працаздольнага грамадзяніна СССР.

Тав. Кржыжаноўскі лічыць, што такі довад росту народнае гаспадаркі СССР павінен быць скарыстаны ў барацьбе з усякага роду апартуністычнымі выступленьнямі.

АНГЛІЯ ПЕРАД НОВЫМІ КЛЯСАВЫМІ БАЯМІ

Ілюзіі «прамысловага міру» ўсё больш расьсейваюцца ў макданальдаўскай армії. За апошнія тыдні ўсё больш відавочным становіцца набліжэньне новых буйных прамысловых канфліктаў. **Такія канфлікты насьпяваюць у 4-х буйнейшых галінах ангельскай прамысловасьці, дзе працуюць ня менш 3-х мільёнаў рабочых.** Перш за ўсё кідаецца ў вочы напружанае становішча **ў баваўнянай прамысловасьці.** Толькі дурныя маглі думаць, што 600 тысяч ангельскіх тэкстыльшчыкаў згодзяцца без змаганьня на зьніжэньне іх зарплаты на шылінг на пэнсы з кожнага фунту.

Зараз ужо выяўляюцца першыя рэальныя адзнакі распачатага адпору. Сотні прафсаюзных арганізацый пад націскам мас вымушаны ўхваляць рэзалюцыі, якія асуджаюць арбітражную пастанову. На шматлікіх фабрыках нарастае недавер'е і злосьць у адносінах да прафбюракратаў, на якіх рабочыя перастаюць спадзявацца, як загнаныя іх палітыкай у бязвыхаднае становішча. Вылічыўся таксама працэс выхаду сэцень рабочых з жоўтых прафсаюзаў. Можна думаць, што з прычыны гэтага ў недалёкім будучым зьявіцца прыцёк новых членаў у кампартыю і рух меншасьці.

Аналёгічныя паказальнікі выяўляюцца і ў **шарсьцяной прамысловасьці,** дзе прадпрыемцы ўхвалілі аднадушную пастанову аб зьніжэньні зарплаты на 10 проц. У шарсьцянай прамысловасьці занята некалькі сотень тысяч рабочых, якія складуць таксама адзін з буйных атрадаў у надыходзячай забастовачнай барацьбе.

Трэцяй галінай, у якой намеціліся адзнакі забастовачных баёў, што рыхтуюцца, **зьяўляецца чыгуначны транспарт.** Чыгуначныя прафсаюзы выступілі патрабаваньне аб скасаваньні зьніжэньня зарплаты на 2 з пяловаю процанты, зробленага тады, калі на чале прафсаюзаў стаяў Томас. Чыгуначныя кампаніі, аднак, заяўляюць, што пры цяперашніх умовах зусім немагчыма ўзьняць зарплату на ранейшы ўзровень. Паводзіны двух чыгуначных прафбюракратаў (Крэмпа і Уогдэна) у арбітражнай камісіі па баваўнянай прамысловасьці зрабіла моцнае ўражаньне на рабочых-чыгуначнікаў, паказаўшы ім як сымбаль іх уласнага лёсу ў наступным канфлікце з прадпрыемцамі. Камуністычная партыя і рух меншасьці сустракае цяпер значна большы водгук сярод рабочых-чыгуначнікаў.

Нарэшце, **вугальная прамысловасьць.** І тут ёсьць аднакі падыходзячай буры. Капальняўласьнікі ўжо выпрацавалі пры поўнай ухвале «рабочага» ўраду свой плян «нацыянальнай арганізацыі здабычы і збыту вугалю». Побач з гэтым, капальняўласьнікі, як і трэба было чакаць, катэгарычна адмовіліся абмяркоўваць згоду аб зарплаце ў нацыянальным маштабе. Яны не супярэчылі супроць цэнтралізаванай у нацыянальным маштабе сыстэмы вытворчасьці і збыту вугалю. Але рабаваць рабочых яны хочуць паводле прынцыпу «паددаляй і ўладай», не дапускаючы мацавага выступленьня рабочых у нацыянальным маштабе.

«Рабочы» ўрад выяўляе бязумоўную «актыўпасьць» у вугальным пытаньні. Макданальд сказаў у Дэрхэме прамову, у якой ён заклікаў «упартых» капальняўласьнікаў абмеркаваць пытаньне з гарнякамі і заключыць з імі згоду ў нацыянальным маштабе. Але побач з гэтым «рабочы» ўрад абяцае выдаць законы, рэгулюючыя велічыню рабочага дня, прычым гутаркі ідуць, зразумела, аб кампрамісе за кошт рабочых, які павінен прывесьці да ўвядзеньня 8-мігадзіннага дня замест поўнага аднаўленьня 7-мігадзіннага дня.

Жоўтая фэдэрацыя гарнякоў таксама «рыхтуецца» да барацьбы прызвычаенымі ёй мэтадамі. Яна гуляе ў парляманторызм, ускладаючы ўсе надзеі на «рабочы» ўрад і «мір у прамысловасьці». Тэрміны раённых згод канчаюцца ў канцы гэтага году. Да ўсіх вугальных раёнах рад канфліктаў вырастае ўжо цяпер. **Капальняўласьнікі, зразумела, ні ў грош ня ставяць «папярэджаньні» Макданальда,—наадварот, Макданальд нарэшце зробіць так, як яму заг

ПАРТЫЙНЫЯ ЯЧЭЙКІ! СЬПЯШАЙЦЕСЯ

Як вамі праводзіцца ў жыцьцё лёзунг: **„Няма ніводнага партыйца, які-б ня выпісваў „ЗЬВЯЗДУ“?**

З РАБОТАЙ ПА ПАДПІСЦЫ: **да 1-га кастрычніка засталося толькі 5 дзён**

Праз год у Менску не павінна быць ніводнага няпісьменнага

Камсамол пэдфаку, студэнцкія арганізацыі БДУ распачалі вялікі паход

Зломім інэртнасьць і бюракратызм установаў, пакончым з абураюча-марудными тэмпамі, мабілізуем шырокія колы савецкай грамадзкасьці на падтрыманьне ініцыятывы пралетарскага студэнцтва

Ініцыятыва пралетарскага студэнцтва БДУ

Студэнцкія арганізацыі беларускага дзяржаўнага унівэрсытэту ўхвалілі пастанову аб уступленьні унівэрсытэту ў сацыялістычнае спаборніцтва пад лёзунгам: **за год ліквідаваць няпісьменнасьць у Менску.**

Да гэтае пастановы унівэрсытэт прыйшоў, выходзячы, папершае, з задач, што стаяць перад ім у справе падрыхтоўкі кадраў, падругое, выходзячы з агульных задач нашага культурнага будаўніцтва.

Дзесяткі раз пісалася і гаварылася аб тым, што падрыхтоўка патрэбных нам спэцыялістых толькі па кніжках немагчыма, што ў сыстэму асьветы і выхаваньня студэнтаў павінна ўваходзіць грамадзкая работа, г. зн. работа, што зьвязвае студэнтаў з барацьбой працоўных, з сацыялістычным будаўніцтвам.

Фармальна унівэрсытэт і іншыя нашы навучальныя ўстановы як быццам гэту задачу выконвалі—большасьць студэнтаў мела тую або іншую грамадзкую нагрузку. Але на справе—гэта грамадзкая нагрузка часта зводзілася да тэхнічнай работы, якая нічога не давала ні розуму, ні сэрцу. Яна часта насіла зусім фармальны характар, выкананьне не пераварылася ў простую адпіску (толькі-б значылася, што ты выконваеш якую-небудзь грамадзкую работу). Пры такой абстаноўцы грамадзкай работы яна не магла вырашыць тэй асноўнай задачы, якая перад ёю ставілася, іменна ўцягненьне студэнтаў у сацыялістычнае будаўніцтва, у клясавую барацьбу, яна не магла адыграць тэй выхаваўчай ролі, якая ёй прызначалася.

А між тым, трэба яшчэ і яшчэ раз падкрэсьліць, што спэцыялістых—актыўных удзельнікаў сацбудаўніцтва—мы падрыхтаваць ня здолеем, як-бы добра студэнты не вывучалі ў сьценах унівэрсытэту ленінізм, дыялектычны матэрыялізм і г. д. (а як вядома, і з гэтым справа стаіць далёка ня добра), калі мы не паставім па належную вышыню пазаунівэрсытэцкую грамадзкую работу.

«Наша школа павінна даваць моладзі асновы ведаў, даваць уменьне выпрацоўваць самыя камуністычныя погляды, павінна рабіць з іх асьвечаных людзей. Яна павінна за той час, пакуль людзі ў ёй вучацца, рабіць з іх удзельнікаў барацьбы за вызваленьне ад эксплёататараў... Як трэба вучыцца? Толькі зьвязваючы кожны крок дзейнасьці ў школе, кожны крок вучэньня непарыўна з барацьбою ўсіх працоўных супроць эксплёататараў» (Ленін).

Да гэтага часу, гэта задача, пастаўленая Леніным, ня выканана ні сярэдняй ні вышэйшай школай; яна ня выканана і нашым унівэрсытэтам. А між тым, шлях да яе выканаўня паказаны самім Леніным ў тэй-жа прамове, якую мы вышэй падавалі (прамова на зьезьдзе КСМ).

«На некалькіх прыкладах я пакажу вам наглядна, як гэта выхаваньне молодзі павінна ісьці. Усе гавораць аб ліквідацыі няпісьменнасьці. Вы ведаеце, што ў краіне няпісьменнай пабудаваць камуністычнае грамадзтва немагчыма. Мала таго, каб савецкая ўлада загадала, або каб партыя дала поўны лёзунг, або каб кінуць частку лепшых работнікаў на гэтую справу. Дзеля гэтага трэба, каб само маладое пакаленьне узялося за гэту справу, каб яно зьвязала і гэту нашу справу, мы аб'яднаемся і пойдзем у вёскі, каб ліквідаваць няпісьменнасьць... Вось у гэтым заключаецца камуністычнае выхаваньне. Толькі ў такой рабоце пераўтвараецца малады чалавек або дзяўчына ў сапраўднага камуністага. Толькі ў тым выпадку, калі яны гэтай работай здолеюць дасягнуць практычных посьпехаў, яны становяцца камуністымі». (Ленін).

Выконваючы просты наказ Леніна, выконваючы пастанову ЦК КП(б)Б, беларускі дзяржаўны унівэрсытэт і ставіць перад сабой задачу: за год ліквідаваць няпісьменнасьць у Менску на 100 проц.

У Менску каля 9.000 няпісьменных (колькі-небудзь дакладных лічбаў ні ЦСУ, ні ТПН назваць, на жаль, не маглі), у беларджаўнівэрсытэце больш за 3.000 студэнтаў. Няўжо, калі ўзяць пад увагу, што мы маем у Менску і камвуз, і тэхнікумы, няўжо можна сумнявацца ў тым, што выкананьне пастаўленай задачы немагчыма, што адмаўленьне ад пастаноўкі такой задачы ня можа быць апраўдана нічым. Толькі безнадзейнай інэртнасьцю, бюракратызмам, нявер'ем у нашы сілы можна вытлумачыць тыя папярэджваючыя галасы, якія ўжо зараз чутны « а ці ня лепш паставіць задачы больш меншыя», «усё роўна нічога ня будзе», «не за сваю справу берацёся» і г .д.

Гэтым сумненьням, пад якімі хаваецца нежаданьне пакончыць з тым абураючым тэмпам, якім да гэтага часу ішла работа па ліквідацыі няпісьменнасьці, павінен быць даны адпор усёй савецкай грамадзкасьцю.

Ад пралетарскага студэнцтва выходзіць ініцыятыва, значэньне якое цяжка пераацаніць.

Мы не сумняваемся, што гэтая ініцыятыва будзе падтрымана, што другія навучальныя установы паследуюць прыкладу БДУ, што на пастаўленай задачы будзе сканцэнтравана увага камсамолу, жанаддзелу, прафсаюзаў, будзе зломлена супраціўленьне бюракратаў, тых, якія баяцца ломкі папяровых плянаў.

Будзе выканана задача, якая мае гістарычнае значэньне, будзе выканана дырэктыва ЦК КП(б)Б. Праз год мы зможам сьвяткаваць поўную ліквідацыю ў горадзе аднэй з самых цяжкіх спадчын мінулага—няпісьменнасьці.

Е. Р.

За новы баявы тэмп у ажыцьцяўленьні вялікай справы

Дзякуючы ініцыятыве БДУ, аб якой паведамляецца вышэй, задача поўнай ліквідацыі няпісьменнасьці ў Менску ставіцца на практычныя рэйкі, яна робіцца зусім магчымай для выкананьня, зусім рэальнай. Трэба толькі, каб за гэту справу ўзяліся зараз-жа, не марнуючы ні аднаго дня, ніводнай хвіліны, бо ўсе тэрміны для падрыхтоўкі новага навучальнага году ўжо прапушчаны, а між тым да гэтага часу ў гэтай галіне зроблена вельмі мала.

Калі мы хочам, каб ліквідацыя няпісьменнасьці ня была сарвана, калі мы хочам выканаць гэту задачу поўнасьцю на працягу году (а толькі так і павінна быць пастаўлена пытаньне), трэба зараз-жа правесьці рад практычных мерапрыемстваў. Перш за ўсё трэба на працягу бліжэйшых двух тыдняў правесьці поўны падлік няпісьменных у Менску. Тут трэба адмовіцца ад саматужніцкіх мэтадаў, ад надзеі на самацёк, на тое, што няпісьменныя прыдуць рэгістравацца самі і г. д.

Трэба самім нам пайсьці з вуліцы на вуліцу, з двара ў двор, заходзячы ў кожную кватэру, не абыходзячы сутарэньняў і вышак, пытаючыся ва ўсіх, хто жыве ў даных кватэрах і запаўняючы картку на кожнага няпісьменнага. Трэба правесьці пераніс усіх няпісьменных, арганізаваны паводле ўсіх патрабаваньняў сучаснай статыстыкі, перапіс, які даў-бы нам ня толькі лічбу агульнае колькасьці няпісьменных, але і даныя аб разьмеркаваньні гэтых няпісьменных па асобных раёнах гораду, вуліцах, нават дварох, даныя аб месцы работы, узросьце няпісьменных і г. д. Бяз гэтых даных работа ліквідацыі няпісьменнасьці ня прыходзіцца.

Ці можна правесьці такі перапіс за кароткі тэрмін? Можна, **калі ЦСУ возьме на сябе кіраўніцтва перапісам і распрацоўку яго даных,** калі ў распараджэньне ЦСУ будуць кінуты на адзінадва дні перапісу 1-1 з палов. тысячы студэнтаў, вучняў нашых школ, настаўнікаў і г. д.

Гэта армія перапісчыкаў, абыходзячы ўсе кватэры, разам з гэтым можа выканаць вялікую агітацыйную работу, пагаварыўшы з кожным няпісьменным у паасобку.

Але адначасова з гэтым трэба, каб нашы партыйныя і камсамольскія, прафэсыянальныя і грамадзкія арганізацыі разгарнулі вялікую работу па растлумачэньні значэньня тэй задачы, якая пастаўлена. Зараз праводзіцца месячнік па ліквідацыі няпісьменнасьці, але, на жаль, ён праводзіцца так, што маса аб ім нічога ня ведае.

Фактычна гэты месячнік стаіць перад зрывам. А між тым, трэба мець на ўвазе, што адна з галоўных труднасьцяй работы заключаецца ў тым, што частка саміх няпісьменных часта не жадае навучацца, наведвае заняткі вельмі неакуратна, нават калі яны назначаюцца ў іх дома. Прыдзе ліквідатар у вызначаны час, а дома няма нікога і г. д.

Каб гэту труднасьць перамагчы, трэба, не абмяжоўваючыся тэй работай, якая будзе праведзена пры перапісе, разгарнуць вялікую агітацыйную кампанію ўсім нашым арганізацыям.

І ў першую чаргу трэба, каб за гэта ўзяўся **жанаддзел.** Сярод жанчын мы маем асабліва вялікі процант няпісьменных, сярод іх больш за ўсё неарганізаваных, яны задушаны работай на гаспадарцы, на іх больш за ўсё адбіваюцца тыя харчовыя затрудненьні, якія мы перажываем.

Таму гэта галіна работы асабліва цяжкая, тут ліквідацыя няпісьменнасьці сустракае найбольшыя затрудненьні. Але мы маем з другога боку **вялікі і ня кепска працуючы апарат дэлегацкіх сходаў** і, апіраючыся на яго, мы здолеем перамагчы ўсе труднасьці, што стаяць перад намі. Трэба паставіць пытаньне аб ліквідацыі няпісьменнасьці на дэлегацкіх сходах, трэба будзе мабілізаваць дэлегатак для арганізацыйнай і агітацыйнай работы. Жанаддзел можа і павінен паставіць гэту работу ў цэнтры сваёй ўвагі, бо цяжка прадставіць, якія вялікія магчымасьці адкрыюцца перад жанаддзелам, калі поўнасьцю будзе ліквідавана няпісьменнасьць. Вялікая работа ўскладаецца і на прафсаюзы. Яны павінны правесьці такую работу сярод рабочых, каб ня толькі самі рабочыя пайшлі вучыцца, але каб яны паслалі вучыцца сваіх жонак ці, прынамсі, не перашкаджалі ім вучыцца, як гэта часта, на жаль, да гэтага часу бывае. Ва ўсіх клюбах, на масавых сходах рабочых, работніц, жонак рабочых павінна быць пастаўлена ў бліжэйшыя дні пытаньне аб ліквідацыі няпісьменнасьці. Прафсаюзы павінны таксама дапамагчы і ў арганізацыйнай рабоце, у прадастаўленьні памяшканьня для заняткаў і г. д.

Мы спаткаемся з аднэй галоўнай перашкодай — з недахватам падручнікаў. Было-б памылкаю, якую нельга дараваць, калі-б мы сказалі сабе: аддягнем заняткі да атрыманьня кніг. Ад гэтага раўненьня на вузкіх мясцох мы адмовіліся ў галіне гаспадарчага будаўніцтва, ад іх час адмовіцца і ў галіне будаўніцтва культурнага. Трэба і тут, ужыўшы, зразумела, усе меры для найхутчэйшага атрыманьня падручнікаў, мабілізаваць грамадзкасьць для перамаганьня гэтага вузкага месца.

Амаль у кожным доме можна знайсьці стары ламантар, стары падручнік, які саслужыў ужо сваю службу. Чаму-б, напрыклад, пінэрам і камсамольцам не наладзіць збор старога савецкага, зразумела, ламантару, хрыстаматыі, як быў наладжаны збор паперы, збор жалезнага лому і г. д.

Зразумела, тое, што мы атрымаем, у выніку збору, ня будзе поўнасьцю адпавядаць нашым мэтам, але пачаць вучыцца можна будзе. Адначасова трэба выпусьціць невялікую брашурку, хаця-б у 16 старонак, напісаную буйным шрыфтом, якую таксама можна будзе спачатку скарыстаць. Усімі гэтымі мерамі можна забясьпечыць, каб работа ў ліквпунктах пачалася ўжо ў самы бліжэйшы час.

Трэба в самага пачатку падумаць яшчэ аб адным, з першага погляду невялікім тэхнічным пытаньні — забесьпячэньні ліквідатараў дармовымі білетамі на аўтабусы (а калі будзе трамвай, то і на трамваі) для праезду да месца заняткаў і назад. Гэта дробнае пытаньне, але невырашэньне яго можа мець буйныя вынікі. Практыка Саратаву, дзе гарсавет марудзіў з вырашэньнем гэтага пытаньня, паказала, што такая дробязь можа сарваць усю работу. **Мы ўпэўнены, што Менскі гарсавет у бліжэйшыя-ж дні ўхваліць пастанову, якая з гэтага боку забясьпечыць усю работу.**

Нарэшце, апошняе пытаньне, на якім мы лічым патрэбным спыніцца, гэта пытаньне аб кіраўніцтве ўсёй работай. Зусім відавочна, што перадаць гэту работу, якая можа быць праведзена толькі пры мабілізацыі ўсёй грамадзкасьці, якому-небудзь ведамству немагчыма.

Патрэбна стварэньне **спэцыяльнага штабу** пры гарсавеце. Пры гэтым ні ў якім выпадку нельга складаць гэты штаб **толькі** па прыцыпе прадстаўніцтва ад установаў. Дзеля таго, каб узяць у гэтай рабоце новыя тэмпы, дзеля таго, каб пакончыць з абураючай інэртнасьцю, што панавала дзе-ні-дзе да гэтага часу ў гэтай рабоце, трэба поўнасьцю скарыстаць ініцыятыву і ўздым нашай моладзі, нашай грамадзкасьці, **трэба ўцягнуць у штаб добрых арганізатараў,** здольных, як сьлед, працаваць.

Толькі пры такім падборы штабу справа можа разьлічваць на посьпех. Такі штаб павінен быць створаны ў бліжэйшым-ж дні.

ПЭДФАКАВЕЦ.

Абвясьціць агульны студэнцкі паход за грамату

Пастанова 2-га курсу прыродазнаўчага аддзяленьня пэдфаку БДУ:

Дабіцца ў гэтым годзе поўнай ліквідацыі няпісьменнасьці ў г. Менску.

Абвясьціць агульны студэнцкі паход за грамату.

Абвясьціць сябе цалкам мабілізаванымі ў галіне грамадзкай працы на справу ліквбезу.

Выклікаць другі курс фізмату на сацыялістычнае спаборніцтва па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Мабілізаваць сябе для перапісу няпісьменных па г. Менску і выклікаць усіх студэнтаў БДУ.

Прэзыдыум сходу.

НЯ ГУТАРКАМІ, А СПРАВАЙ

Пастанова ЦК КП(б)Б гаворыць аб неабходнасьці стопроцантнай ліквідацыі няпісьменнасьці ў гарадох. У Менску для выкананьня гэтае пастановы нам патрэбны кадры, памяшканьні, падручнікі і ўдзел усіх грамадзкіх і савецкіх арганізацый у гэтай рабоце.

Пэдфак БДУ першы пачаў справу мабілізацыі шырокіх грамадзкіх мас за справу ліквідацыі няпісьменнасьці. Пастановы літаратурнага, прыродазнаўчага і матэматычнага аддзяленьняў пэдфаку гавораць аб тым, што мабілізавана ўсё студэнцтва для ліквідацыі няпісьменнасьці. Удзел шырокай грамадзкасьці пачынае падмяняць бюракратычныя ведамственныя адносіны ў мінулым да справы ліквідацыі няпісьменнасьці з боку органаў Наркамасьветы.

21-га верасьня на нарадку дня прэзыдыуму цэнтральнага савету ТПН было пастаўлена пытаньне аб ліквідацыі няпісьменнасьці ў Менску. З дакладу і спрэчак можна было канстатаваць, што падрыхтоўка на сёнешні дзень праведзена габінэтным шляхам бяз удзелу шырокай грамадзкасьці. Прапановы аб прыцягненьні грамадзкасьці ў часе месячніка за пісьменнасьць засталіся толькі думкамі. Эфэкту ад гэтай работы ня было. Бюракратычныя спробы паасобных работнікаў на прэзыдыуме ЦС апраўдацца, што былі даны паказаньні аб пачатку навучальнага году, аб кадрах, аб падручніках, не знайшлі спачуваньня з боку ўдзельнікаў цэнтральнага савету. Адзначыўшы, што па Менску праблема слабая работа, якая праводзілася толькі ведамственым шляхам, ЦС ТПН пастанавіў вылучыць часовую асобную камісію з 5 чалавек, якой даручана распрацаваць пытаньні адносна ўліку ўсяго няпісьменнага насельніцтва па Менску, вылучэньне кадраў са студэнцтва для перапісу і практычнай работы ў ліквпунктах на працягу навучальнага году, стварэньне шырокае грамадзкае думкі вакол ліквідацыі няпісьменнасьці праз друк, праз сходы розных арганізацый, мабілізацыя шырокіх пластоў грамадзкасьці для правядзеньня палітыка-асьветнай работы ў ліквпунктах.

У бліжэйшыя дні камісія павінна даць папярэдніі вынікі сваёй работы. Мы іх чакаем.

В. М-н.

Апошнія падзеі ў Мароко

Непранікальная заслонай хлусьні, паклёпу і правакацыі француская буржуазія атуляе падзеі, што адбываюцца ў Мароко. Сэнс гэтых падзей, аднак, зусім відавочны. Францускі імпэрыялізм падыходзіць да апошняга этапу «ўціхаміраньня» Мароко, да разгрому да гэтага часу непераможных плямён у раёне Сярэдняга і Верхняга Атлясу. Гэтыя плямёны колькасьцю за 150 тыс. чалавек раскіданы па крутых схілах горнага ланцугу Атлясу і ў непраходных цясьнінах Тафілалента на адлегласьці у 40 тысяч кв. кілёмэтрў. Фарсаванае наступленьне на гэту апошнюю апору марканскай незалежнасьці выкліканы многімі важнымі меркаваньнямі як стратэгічнага, так і эканамічнага парадку. Папершае, праз раён, займаемы непакорлівымі плямёнамі, павінна прайсьці славутая Трансазарская чыгунка, якая злучыць Алжыр з францускімі калёніямі ў Заходняй Афрыцы—з гэтым рэзэрвуарам трапічных натуральных багацьцяў чорных кантынгэнтаў для францускай арміі, якія перавозіць па Атлянтычным акіяне ў час вайны будзе вельмі небясьпечна. Падругое, расправіўшыся з незалежнымі плямёнамі, францускі капітал стане манапольным гаспадаром вялікіх зямельна-жывёлаводчых фондаў і вялізнага горнага раёну, з багацейшымі пакладамі жалеза, цынку, волава, вугалю, фасфатаў і нават нафты, з наліччам таннай рабочай сілы, пры надзвычайна выгадным становішчы морскіх портаў і непасрэдней блізкасьці Францыі. Патрэцяе, у «бунтуючай» вобласьці ёсьць рака Уэд-Эль-Абід і інш. крыніцы водзнае энэргіі, ад якіх залежыць ірыгацыя і электрыфікацыя часьці Мароко. Пачацьвертае, нарэшце, справа ідзе аб выкараненьні апошняй «заразы» ў Мароко, аб узмацненьні свайго прэстыжу ў вачох тубыльцаў і аб падтрыманьні вайсковага «гонару», бо, паводле слоў буржуазных газэт, «у мусульманскай краіне сіла зьяўляецца галоўным сродкам, які можа забясьпечыць маральны прэстыж эўрапэйцаў».

Францускі генэрал-губэрнатар у Мароко Люсьен Сэн, які зьмяніў Стэга, заявіў, што ён будзе весьці палітыку свайго папярэдніка, г. зн. працягваць «мірнае прасоўваньне» ў Мароко. У яго ёсьць для гэтага вялікая практыка, якую ён набыў яшчэ ў часе жорсткага падаўленьня вызваленчага руху ў Тунісе. І, сапраўды, францускія войскі, сабраныя ў вялікай колькасьці, працягваюць разьвіваць канцэнтрычнае наступленьне супроць «мяцежных» бэрбэрскіх плямён, ізалюючы іх ад ужо «ўціхаміраных» раёнаў. Баі перанесьліся цяпер у раён Верхняга Уэд-Эль-Абід. На паўднёвыя схілы Вялікага Атлясу, паміж Верхнім Зізам і раўчуком Дадэ, уключаючы сюды і вобласьць Аіт-Ата.

Орган францускіх мілітарыстых «Ля Франс Мілітэр» хвалячыся паведамляе аб добраахотным падпарадкаваньні французам уплывовых мараканскіх плямён і аб бяскроўным шэствіі францускіх цывілізатараў у глыбіню Мароко, і... тут-жа побач прыводзяцца вялізарныя сьпісы ўзнагароджаных афіцэраўмясьнікоў і салдат за ўдалыя крывавыя дзеяньні супроць мараканца.

В.

Партыйнае будаўніцтва

Рэзалюцыя агульнага сходу ячэйкі КП(б)Б Камуністычнага Унівэрсытэту Беларусі імя Леніна

Заслухаўшы даклад т. **Галадзеда** аб выніках верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б, агульны сход ячэйкі КП(б)Б Камуністычнага унівэрсытэту Беларусі імя Леніна цалкам і поўнасьцю далучаецца да пастаноў пленуму і абяцае аддаць усе свае сілы на справу ажыцьцяўленьня пастаўленых партыяй вялізарных задач.

1. Вызначаны пленумам плян рэканструкцыі народнае гаспадаркі патрабуе ад усёй партарганізацыі і ў прыватнасьці ад нашае ячэйкі ўсямернае актыўнасьці ў справе абароны правільнай партыйнай лініі, у справе барацьбы з поглядамі права-апартуністычнай апазыцыі, з прымірэнчымі да яе адносінамі і «левымі» заскокамі, у справе барацьбы з канкрэтнымі праявамі правага ўхілу пры ажыцьцяўленьні пляну сацыялістычнай рэканструкцыі народнае гаспадаркі БССР у 1929-30 г.

2. Прызнаючы, што ўмовамі ажыцьцяўленьня пляну зьяўляюцца: чыстка дзяржапарату, вылучэньне новых рабочых кадраў, уздым творчага энтузіязму працоўных мас у сацыялістычным спаборніцтве, пераход на бесьперапынны тыдзень, павышэньне якасных і колькасных паказальнікаў народнае гаспадаркі, асабліва яе сацыялістычнага сэктару, агульны сход даручае бюро ячэйкі распрацаваць рад мерапрыемстваў па ўзмацненьні актыўнасьці, вучоту і кантролю масавай партработы членаў ячэйкі, прымацаваных да прадпрыемстваў і ўстаноў.

3. Надаючы асаблівае значэньне справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі, сход даручае бюро ячэйкі правесьці агляд калгаснага будаўніцтва ў падпэфным нам раёне, абярнуўшы гэты агляд у баявую справу агульнай барацьбы за сацыялістычную рэканструкцыю вёскі, за выкарчоўваньне капіталістычных карэньняў шляхам бязьлітаснае барацьбы з кулацкім супроцьдзеяньнем. Вынікі і сьляды кулацкай работы Прышчэпава і К-о павінны быць зьнішчаны ў вёсцы дашчэнту.

4. Падкрэсьліваючы паўнейшую правільнасьць прынятых партыяй пастаноў, якія знайшлі сваё пацьвярджэньне ў выкананьні з агульным перавышэньнем пляну 1928-29 гаспадарчага году і маюць поўную рэальнасьць у намечаным пляне на 1929-30 год, ячэйка лічыць, што ўсе вялізарнейшыя задачы, якія вынікаюць з пляну, могуць быць зьдзейсьнены толькі пры поўным разгортваньні самакрытыкі і самадзейнасьці мас.

5. Лічачы, што ва ўмовах БССР сацыялістычная рэканструкцыя нашай гаспадаркі сустракае асаблівае процідзеяньне з боку нацыянал-дэмакратычных груп, сход ячэйкі з асаблівай сілай падкрэсьлівае значэньне барацьбы на даным этапе з нацыянал-дэмакратызмам, які зьяўляецца адбіткам росту актыўнасьці капіталістычных элемэнтаў гораду і вёскі, не паслабляючы тэмпу беларусізацыі ў далейшым.

Агульны сход адзначае важнасьць і патрэбнасьць пастаноўкі пытаньня аб стварэньні новых пралетарскіх кадраў, якія-б былі здольны змагацца ва ўсіх галінах народнае гаспадаркі за яе сацыялістычную рэканструкцыю, за генэральную лінію партыі.

Камісія ЦК УсеКП(б) абсьледуе па рэтарганізацыі часьцей БВА

У другім артпалку самакрытыка слаба разгарнута.—На працягу 7 месяцаў сакратар ячэйкі вёў разбураючую работу.—Папітработа на агульных зборах раз гортвалася павольным тэмпам

Жыцьцё ў часьцях, што абсьледуюцца, у зьвязку з работай камісіі ўскалыхнулася.

Хваля масавай самакрытыкі, што разгарнулася на партыйных сходах, на сходах начальніцкага складу, садзейнічала выкрыцьцю цэлага раду сур'ёзных недахопаў у рабоце партарганізацыі, начскладу і паліторганаў. Так, напрыклад, на сходах начскладу ў палкох, якія часамі цягнуліся па два вечары, зусім яскрава высьветлілася, што партыйныя арганізацыі часьцей яшчэ вельмі многага не зрабілі для ўстанаўленьня сапраўднага адзінства і згуртаванасьці ў рабоце начскладу.

У палкавой школе №-скага палка па ініцыятыве камісіі ЦК, было арганізавана адкрытае пасяджэньне прэзыдыуму Менскай акруговай КК. КК другі раз разглядала пытаньне аб выключаным у часе чысткі партыі сакратары ячэйкі школы—Гайкаву. Пасьля абсьледваньня работы ў палку стала зусім ясным, што Гайкаў зусім незаслужана быў цяжка пакараны і што такая пастанова зьявілася ня толькі памылкай камісіі, але і вынікам вельмі слабой разгорнутай самакрытыкі ў палку, узьвязку з чым і была магчыма скажоная ацэнка работы Гайкава, як члена партыі.

Сходы партактыву і начскладу у №-скім артылерыйскім палку паказалі, што самакрытыка ў гэтым палку была вельмі слаба разгорнута і што там камісар палка, зрабіўшы парадныя прамовы аб самакрытыцы, зусім не паклапаціўся ад тым, каб самакрытыка сапраўды садзейнічала рашучай барацьбе з яўна-абураючымі недахопамі. З прычыны такога «разгортваньня самакрытыкі» з боку камісара і атрымалася тое, што ў №-скім артпалку ячэйка аднэй з батарэй на працягу 7 месяцаў ніяк не магла зьняць свайго сакратара, які вёў яўна шкодную работу.

У №-скім палку выкрытыя ў парадку самакрытыкі недахопы зьнішчаецца вельмі павольна.

Наогул, ня гледзячы на тое, што агульныя зборы палка працягваюцца ўжо два тыдні, палітычная работа сярод пераменнага складу разгорнута далёка невыстарчальна.

У абедзьвюх тэрытарыяльных дывізіях, абсьледаваных камісіяй ЦК, выкрыт надзвычай павольны тэмп разгортваньня палітычнай работы на агульных зборах пераменнага складу. Наўрад ці трэба гаварыць аб тым, наколькі сур'ёзны гэты недахоп для тэрытарыяльных часьцей.

Факты слаба разгорнутай самакрытыкі ў часьцях, факты супраціўленьня і змазваньня самакрытыкі з боку асобных кіруючых работнікаў у часьцях адбіваюць ня толькі павольны тэмп перабудовы работы партарганізацыі у духу дырэктыў ЦК, але і рад няспрыяючых вучасткаў ў кіруючай рабоце палітычных органаў дывізіі.

Сходы партыйных актываў і дзьвёх дывізій гэта добра пацьвердзілі. У рэзалюцыях дывізійных актываў недахопы ў рабоце падзіваў і ДПК падрабязна адзначаны.

Гаворачы аб недахопах і хваравітых зьявішчах у рабоце часьцей, нельга не адзначыць сур'ёзных недахопаў у справе дапамогі часьцям з боку мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый. Асабліва гэта датычыць Менскага акруткому УсеКП(б), які амаль не правяраў, ці выконвалі яго ўласныя дырэктывы аб вайсковай рабоце і дапамогі часьцям.

Ва ўсіх гарадох, дзе працуюць члены камісіі ЦК, парткомы арганізуюць праверку сваёй работы ў справе дапамогі часьцям Чырвонай арміі.

Г. Г.

«Кр. Пр.».

НА УМАЦАВАНЬНЕ СЛАБЫХ ВУЧАСТКАЎ ПАСТАВІЦЬ САМЫХ ВЫТРЫМАНЫХ ТАВАРЫШОЎ

Ці могуць выкараняць скрыўленьне клясавай лініі тыя, якія яе самі скрыўляпі

У сваёй рашучай барацьбе супроць права-апартуністычнай апазыцыі, разгортваючы шырокую пралетарскую самакрытыку, партыя за апошні час выкрыла рад выпадкаў скажэньняў генэральнай лініі партыі, выявіла рад слабых вучасткаў у рабоце апаратаў пралетарскай дзяржавы. Тыя кіраўнікі, якія не змаглі пабальшавіцку ажыцьцяўляць у сваёй практычнай работе ленінскай, клясавай лініі партыі, якія не змаглі ўстаць перад напорам і шалёным супраціўленьнем капіталістычных элемэнтаў, нацыянал-дэмакратаў і іншых ворагаў сацыялістычнага будаўніцтва, гэтыя кіраўнікі з работы зьняты. І зусім правільна. Бо той пэрыяд, у які баявым тэмпам ідзе пераможнае наступленьне сацыялістычных элемэнтаў на капіталістычныя, патрабуе высокай бальшавіцкай прынцыповасьці і клясавай баяздольнасьці ад кожнага працаўніка, якому партыя даручыла той ці іншы вучастак работы.

Перад партыяй паўстала задача ўмацаваць зьверху і да нізу кожнае зьвяно работы і кіраўніцтва, умацаваць асабліва тыя вучасткі, на якіх выяўлены прарывы. Ці заўсёды мы гэту задачу выконваем з посьпехам? Трэба сказаць проста і адкрыта—не заўсёды.

А што гэта так, падамо такі прыклад. У Менакрфа выкрыта і ўжо асуджана пралетарскай грамадзкасьцю спаўзаньне часткі работнікаў апарату. Яны з работы зьняты. А хто пастаўлены для выпраўленьня іх апартуністычных памылак.

На пасаду **загадчыка Менакрфа** прызначаны **т. Жук,** таварыш, які ў свой час, будучы старшынёй Чэрвеньскага, а потым Смалявіцкага РВК, меў сувязь з кулакамі і нэпманамі (справа з абрэзкай сенажаці ў кулака Вэрсоцкага, справа з арэндатарам млына кулаком Бардзілоўскім, здача пазыцый Нэйманам у Чэрвеньскім камбінаце). За гэтыя ўчынкі пазалетась і летась у 1928 г. т. Жук меў партыйныя спагнаньні (ад РК КП(б)Б, ад Менскай АКК).

Значыць, абвінавачваньні т. Жука ў сувязі з кулакамі ўгрунтаваны, партыйныя органы далі пакаранні яму не дарэмна.

І дзіўна, чаму Менскі акрвыканком, ведаючы (а ён гэтага ня мог ня ведаць) пра сувязь т. Жука з кулацтвам, зараз даручыў яму такі адказны пост і работу, як выпраўленьне права-апартуністычнай лініі старога кіраўніцтва Менскага акрфа.

Партыйныя масы, ведаючы пра факты сувязі т. Жука з кулакамі, толькі дзіву даюцца, як гэта дапушчаюцца такія зьявішчы.

Выходзіць—«клін клінам выбіваюць»—пасылаюць выпраўляць скрыўленую клясавую лінію таго, хто сам не скрыўляў у сваёй практычнай рабоце, хто меў сувязь з кулацтвам. На ўмацаваньне слабых вучасткаў мы павінны паставіць такіх таварышоў, якія зарэкамандавалі сябе зусім вытрыманымі і клясава-баяздольнымі работнікамі.

Я.

Хроніка чысткі савецкіх ячэек у Менску

Скончылася праверка і чыстка ячэйкі КП(б)Б працкалектыву мэхлеўшчыкаў. Чыстка цягнулася 5 дзён. Праверана 15 чал.

* * *

22-га верасьня **пачалася чыстка партячэйкі банкаўскіх устаноў.** Два вечары былі прысьвечаны абмеркаваньню дакладу бюро ячэйкі. Ужо прыступлена да праверкі членаў ячэйкі.

* * *

Чыстка **ячэйкі КП(б)Б пажарнай каманды** пачнецца ў суботу 28-га верасьня і будзе цягнуцца 29, 30 верасьня і 1-га кастрычніка.

* * *

У Чацьвер 26-га верасьня пачынаецца праверка і чыстка **ячэйкі КП(б)Б мэталяўстаноў.**

* * *

У бліжэйшы тыдзень пачнецца праверка і чыстка наступных ячэек Кастрычнікавага раёну: **Белжылсаюзу, Наркамфіну, дому груднога дзіцяці, МЦРК, НК РСІ, НКЮ, Белкаапсаюзу, Страхкасы, Белсампрамсаюзу.**

Ячэйка КП(б)Б **працасьветы** будзе праходзіць праверку і чыстку з 24-га верасьня да 6-га кастрычніка. Чыстка будзе адбывацца ў доме асьветы. Усяго будзе праверана 82 чал.

* * *

Праверка і чыстка ячэйкі **музтэхнікуму** пачнецца 7-га кастрычніка і будзе цягнуцца тры дні. Усяго будзе праверана 13 чал.

* * *

Чыстка ячэйкі **Белдзяржкіно** будзе адбывацца з 14 па 17 кастрычніка. Усяго па гэтай ячэйцы праходзіць чыстку 12 чал. Праверка будзе адбывацца ў Доме Асьветы.

* * *

18-га кастрычніка ў клюбе друкароў пачнецца чыстка **партячэйкі Белдзяржвыдавецтва.** Чыстка будзе працягвацца да 25-га кастрычніка. Усяго будзе праверана 42 чал.

* * *

З 26-га па 30-га кастрычніка ў клюбе дрэваапрацоўшчыкаў будзе адбывацца праверка і чыстка ячэйкі **Наркамасьветы.** Будзе праверана 20 чал.

* * *

Ячэйка КП(б)Б **Беларускай Акадэміі Навук** будзе праходзіць чыстку пачаўшы з 31-га кастрычніка да 5-га лістапада. Чыстка будзе адбывацца ў клюбе друкароў. Праверку пройдуць 28 чал.

* * *

З 11-га па 13-га лістапада будзе адбывацца чыстка ячэйкі КП(б)Б **Яўрэйскага Белдзяржтэатру.** Будзе праверана 6 чал.

* * *

Ячэйка Белпэдтэхнікуму будзе праходзіць праверку і чыстку з 18-га па 20-га кастрычніка. Усяго будзе праверана 20 чал.

З-я пазыка індустрыялізацыі—у вёску

Урачыстыя заявы і горкая сапраўднасьць

Каапэрацыйныя арганізацыі зусім не распаўсюджваюць пазыку

Гэтымі днямі адбылося пасяджэньне центральнай камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчаднай справе. На пасяджэньні быў заслуханы даклад НКФ БССР тав. **Мікуліча** аб ходзе рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

Тав. Мікуліч адзначыў, што падпіска сярод рабочых і служачых праходзіць пасьпяхова, з вялікім уздымам.

Разам з гэтым, кажа далей тав. Мікуліч, у вёсцы і сярод неарганізаванага насельніцтва кампанія рэалізацыі пакуль што праходзіць нездавальняюча, асабліва дрэнна рэалізуецца пазыка ў такіх акругах, як Аршанская, Магілеўская, Бабруйская, Мазырская. Некаторыя акругі, як відаць, супакоіліся на тым, што ў вогуле выканалі кантрольныя лічбы (хаця Аршанская акруга пакуль што не зрабіла і гэтага) і зусім забыліся пра тое, **што выкананьне агульнае кантрольнае лічбы не вызваляе акругі ад адказнасьці і неабходнасьці выкананьня кантрольнае лічбы па асобных групах насельніцтва.**

Далей былі заслуханы даклады **каапэрацыйных цэнтраў**—Белсельбанку, Белсельсаюзу, Бел

ПАДВОІМ ТЭМПЫ ХЛЕБАЗАГАТОВАК

У самы кароткі тэрмін зьбярэм: Увесь закантрактаваны хлеб і хлебныя лішкі

АРГАНІЗУЕМ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКУЮ ГРАМАДЗКАСЬЦЬ, ЗЛОМІМ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ КУЛАКА, ДАМО ПА РУКАХ СПЭКУЛЯНТАМ, ЯКІЯ ДЭЗАРГАНІЗУЮЦЬ ХЛЕБАЗАГАТОЎКІ

Каапэратарам, якія ня здольны праводзіць у жыцьцё дырэктывы партыі і прымірэнча адносяцца да кулака, ня месца ў нашых загатоўчых арганізацыях

Верасьнёўскі плян--пад пагрозай невыкананьня

Хлебазагатоўшчыкі чакаюць „самацёку"...

Узяты намі паскораны тэмп разьвіцьця ўсёй нашай народнай гаспадаркі выклікае неабходнасьць фарсаваньня ходу ўсіх эканамічна-гаспадарчых працэсаў. Адно з першых месц тут адводзіцца хлебазагатоўкам, бо ад колькасьці хлеба, які паступіць у рукі дзяржавы, залежаць многія нашы гаспадарчыя разьлікі.

Тыя марудныя тэмпы ў ходзе хлебазагатовак, якія мы ў Беларусі мелі ў мінулым годзе, нас зараз зусім задаволіць ня могуць — яны ня прыгодны для гаспадарчай абстаноўкі гэтага году, якая патрабуе новых паскораных тэмпаў. У гэтым годзе мы ў Беларусі да 1-га студзеня павінны выканаць 75 проц. усяго задавога пляну па хлебазагатоўках.

Мы павінны канстатаваць, што гэты патрэбны нам хуткі тэмп яшчэ не праяўляецца ў рабоце нашых хлебазагатоўчых арганізацый. Многія нашы хлебазагатоўшчыкі паддаюцца такому нагрыву — «у хлебазагатоўкі зараз уведзен грамадзкі мэтад работы, пляны даходзяць да асобных нёсак, тут працуюць партыйныя арганізацыі, сельсаветы, вясковая грамадзкасьць, так што хлеб усё роўна да мяне дойдзе».

Такія шкодныя настроі, якія могуць пераварыць хлебазагатоўшчыкаў у мэханічных прыёмшчыкаў хлеба, павінны быць выкаранены ў самым зародку. Хлебазагатоўшчыкі павінны выйсьці з пасыўнага стану і праявіць максымальную актыўнасьць, а не чакаць самацёку, арганізаваць грамадзкую думку вакол хлебазагатоўчае кампаніі.

За першую дзесяціднёўку плян ня выканан

Зьвярнемся зараз да лічбовых вынікаў хлебазагатовак па БССР за першую дзесяціднёўку верасьня. Нас тут цікавяць загатоўкі хлеба сярод сялян (намольны збор, як абавязковы, паступае пакуль што добра). І вось аказваецца, што загатоўка сялянскага хлеба ў першай верасеньскай дзесяціднёўцы дала слабыя вынікі, якія моцна адстаюць ад пляну. Сярэдні разьмер загатовак па ўсіх хлебазагатоўчых арганізацыях складае ўсяго 18,1 проц. месячнага верасеньскага заданьня. Калі мы возьмем вынікі загатовак па асобных арганізацыях, дык мы атрымліваем такія лічбы: Саюзхлеб — 26,1 проц. месячнага заданьня, Белкаапсаюз — 11,7 проц. і Белсельсаюз — 36,5 проц. Выходзіць, што толькі сельска-гаспадарчая каапэрацыя выканала поўнасьцю заданьне за дзесяціднёўку. Але і тут ня прыходзіцца пераацэньваць гэтых вынікаў — бо сельгаскаапэрацыя атрымала зусім невялікія заданьні, амаль у чатыры разы меншыя пляновага заданьня, ускладненага на спажывецкую каапэрацыю.

Хлебазагатоўшчыкі запэўняюць, што ў другой дзесяціднёўцы верасьня справа пайшла значна лепш — але мы гэтага пакуль што ня ведаем, мы пачакаем лічбаў, якія пацьвердзяць гэтыя запэўненьні.

А цяпер трэба паказаць на тыя паасобныя факты, якія сталі вядомы, на тыя паасобныя недахваты, якія паслабляюць посьпех хлебазагатовак.

Акруговым калгассаюзам трэба сачыць за правільнай і своячасовай здачай калгасамі дзяржаве сваіх хлебных лішкаў, за тым, каб якія-небудзь калгасы не прадавалі свайго хлеба на вольны рынак. А на справе аказваецца, што некаторыя калгассаюзы ня маюць поўных вестак аб валавым зборы збожжа і аб таварнасьці ў тых калгасах, якія ім падпарадкаваны—як-жа пры такіх умовах тут можна кантраляваць?

Прыватнікі дэзарганізуюць рынак

Калі прыватныя скупшчыкі хлеба ў агульнай масе пакуль што трымаюцца пасыўна, дык у паасобных мясцох і раёнах іх шкодны ўплыў ужо адчуваецца. Вось некалькі фактаў. Загатоўка хлеба моцным Мсьціслаўскім спажывецкім таварыствам (Аршанская акруга) тармозіцца з прычыны таго, што хлеб у Мсьціслаўскім раёне закупляецца прыватнікамі па значна павышаных цэнах і вывозіцца ў Смаленшчыну. З Аршанскай акругі паведамляюць, што там наглядаецца наплыў мяшочнікаў з Смаленскай і Маскоўскай абласьцей. Мяшочнікі прыяжджаюць на рынак пад відам сялян з уласным гужавым транспартам. А вось у Мазыршчыне, дзе мяшочнікі адкрыта пакуль што не выступаюць, ёсьць весткі аб нелегальнай перавозцы закупленага хлеба ноччу на чаўнох і фурманках.

Гэтыя першыя адкрытыя і скрытыя выступленьні прыватных скупшчыкаў, якія тармозяць дзяржаўныя загатоўкі, павінны быць ліквідаваны ў самым пачатку, каб яны не атрымалі далейшага распаўсюджаньня.

Наглядаюцца яшчэ чыста тэхнічныя недахопы — то тут, то там не хапае складачных памяшканьняў для прыёмкі хлеба, на некаторых прыёмачных пунктах не хапае тары і пурак (прыбор для вызначэньня якасьці збожжа).

Усе тэхнічныя недахопы павінны быць неадкладна вызначаны. А хлебазагатоўшчыкам трэба, адкінуўшы вяласькь і надзею на самацёк, пераключыцца на шпаркія, паскораныя тэмпы работы.

Пляны хлебазагатовак павінны быць выкананы ў дакладна вызначаныя тэрміны. І гэту баявую задачу дня з тым большым посьпехам можна выканаць, што бядняцка-серадняцкая маса сялянства салідарызуецца з нашай хлебнай палітыкай, арганізуе калектыўную здачу хлеба і падтрымлівае нашы мерапрыемствы адносна націску на кулацкія гаспадаркі.

Л. НЯФЕДАЎ.

Хроніка хлебазагатовак

За апошні тыдзень Смалявіцкаму спажывецкаму таварыству чырвонымі абозамі здана 24.271 клг. жыта, 11.056 клг. еўсу, 387 клг. ячменю. Усяго 35,8 тоны. На верасень месяц таварыствам заданьне выканана на 120 проц. Першымі прыбылі абозы з Варатоўскага і Смалявіцкага сельсаветаў.

Койданаўскаму спажывецкаму т-ву здана 3.500 пуд. хлеба, Грозаўскаму 1.000 пуд., Самахвалавіцкаму—500, Заслаўскаму—550, Лагойскаму—350. Усюды абозы прыяжджалі з чырвонымі сьцягамі. Сяляне абяцалі, што пляны хлебазагатовак будуць выкананы да тэрміну і з перавышэньнем.

Заменім кампанейшчыну штодзённай працай

—Выканаць дагавор на спаборніцтва з Гомельскім акругкомам. Разгарнуць крытыку і самакрытыку ў арганізацыі.—Рашучы пералом у працы на вёсцы.—90 тыс. руб. на дапамогу рэвапюцыянэрам. — На 4.366 руб. закуплена аблігацый 3-й пазыкі індустрыялізацыі

6-я Менская акруговая канфэрэнцыя МОПР'у

23-га верасьня скончыла сваю працу 6-ая Менская акруговая канфэрэнцыя МОПР'у.

На працягу ўсёй працы канфэрэнцыі адчуваўся вялікі ўздым і актыўнасьць дэлегатаў. Работа праходзіла пад знакам дзелавой крытыкі і самакрытыкі.

Па ўсіх дакладах выказаўся 61 чал. Амаль усе, што выступалі ў спрэчках, адзначылі дасягненьні ў працы акругкому МОПР'у. За справаздачны пэрыяд сабрана сродкаў 90 тыс. руб. Пасьпяхова праведзены кампаніі дапамогі рэвалюцыянэрам, як напрыклад: кампанія зімовай дапамогі дапа 14.654 руб., у карысьць кітайскіх рэвалюцыянэраў сабрана капя 10.000 руб. Дзень пяцігодзьдзя МОПР'у БССР даў 6.500 руб., на дапамогу бэрлінскім рабочым сабрана капя 21 тыс. руб. Праведзены рад масавых мэрапрыемстваў (агульна-гарадзкія нарады, масавыя інтэрнацыянальныя вечары, прысьвечаныя VI кангрэсу Камінтэрну і МЧД, інтэрнацыянальная экскурсія ў лягэры і антываенны карнавал).

Посьпехі гэтыя дасягнуты ў часе кампаніі, што пасьпяхова праводзіцца ў горадзе і ў раённых цэнтрах, вёска-ж імі не ахоплена. Сяляне ў іх слаба ўдзельнічаюць. З 54.214 руб. добраахвотных узносаў на 16 вясковых РК прыпадае 9.021 руб. Кульгае штодзённая работа гораду і вёскі. Значна паслаблена праца ва ўсіх вясковых райкомах. Асабліва дрэнна праводзіцца работа ў Астрашыцкім Гарадку, Бярэзіне, Грэску і Халопенічах. З боку АК МОПР'у было невыстарчальнае кіраўніцтва нізавымі арганізацыямі (з 17 вясковых райкомаў абсьледавана і інструктавана 8 райкомаў). Слаба распаўсюджваецца мопраўская літаратура ў горадзе і асабліва ў вёсцы. (Усяго распаўсюджана літаратуры на 7.300 руб., па 16 вясковых РК—толькі на 295 руб.). Бязьдзейнасьць рэвізійных камісій выклікала растраты сродкаў (на гуце «Пралетары»—170 руб., у Астрашыцка-Гарадзецкім РК—25 руб., на гарбарні «Бальшавік»—40 руб.).

Слаба разгорнута крытыка і самакрытыка ў арганізацыі.

— Максымум энэргіі і ўвагі для зьнішчэньня недахватаў. Рашучы пералом у працы на вёсцы. Усю работу перавесьці на масавыя рэйкі.

Мопраўскія арганізацыі павінны прыняць актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве. Удзяліць больш увагі інтэрнацыянальнаму выхаваньню членаў МОПР'у,—вось галоўныя пункты дагавору па спаборніцтве Менскага і Гомельскага акругкомаў МОПР'у, якія аднагалосна зацьвярджаны дэлегатамі канфэрэнцыі. Для заключэньня дагавору з Гомелю прыбыла дэлегацыя на чале з старшынёю Гомельскага АК тав. Кузьняцовым.

Тое, што амаль усе вясковыя райкомы і шмат гарадзкіх ячэек паднесьлі на канфэрэнцыі падарункі палітэзьнявспеным падшэфных турмаў аблігацыямі 3-й пазыкі індустрыялізацыі на 4.366 руб., сьведчыць аб вялікай сьвядомасьці і рэвалюцыйным энтузіязьме членаў МОПР'у.

Тое, што ўсе дэлегаты канфэрэнцыі мабілізавалі сябе добраахвотнікамі Далёка-Ўсходняй армії, сьведчыць аб гатоўнасьці ўсіх мопраўцаў стаць на абарону савецкае краіны.

Пад гучныя сьпевы «Інтэрнацыяналу» закрываецца канфэрэнцыя.

* * *

Новы склад акругкому абраны ў ліку 35 членаў і 10 кандыдатаў і рэвізійная камісія ў складзе 7 членаў і 2 кандыдатаў.

* * *

Учора адбыўся першы пленум новага акругкому і рэвізійнай камісіі. Прэзыдыум выбраны ў складзе 15 членаў і 2 кандыдатаў.

Старшынёю акругкому выбраны рабочы-друкар тав. Цудзін, намесьнікам акругкому—тав. Канстанцінаў, адказным сакратаром акругкому—рабочы тав. Ноім.

МОПРАВЕЦ

Патрэбна цьвёрдая клясавая лінія

За апошні тыдзень па Меншчыне мы наглядаем некаторы пералом у хлебазагатоўках. У раёне раёнаў беднякі і сераднякі арганізоўваюць чырвоныя абовы і здаюць хлеб спажывецкай каапэрацыі. У тых раёнах, дзе бедната добра арганізавана, хлебазагатоўкі праходзяць пад лёзунгам барацьбы з кулацтвам і калектывізацыі вёскі. У Смалявіцкім раёне ў некаторых вёсках кулацтва пад націскам беднаты прымушана здаваць свае лішкі дзяржаве. Такія выпадкі мелі месца ў Жажэлкаўскім сельсавеце, калі кулакі, якія падпісаліся на 5 пуд., пад націскам здавалі па 50 пуд. хлеба.

Наогул бедната Смалявіцкага раёну праводзіць байкот кулакоў, якія не здаюць сваіх лішкаў дзяржаве, а прадаюць іх прыватніку. Бедната праяўляе ў цяперашнюю хлебазагатоўчую кампанію вялікую актыўнасьць. У Варатоўскім сельсавеце бядняцка-сераднякі сход пастанавіў здаць свае лішкі каапэрацыі і паслаў свайго прадстаўніка ў суседні сельсавет, выклікаўшы яго на сацыялістычнае спаборніцтва.

Адначасова ў радзе раёнаў ў хлебазагатоўчай рабоце мы наглядаем паўтарэньне памылак мінулага году. Тут на практыцы мы можам праверыць працу раённых і савецкіх арганізацый, як яны праводзяць генэральную лінію партыі. Калі мы азнаёмімся в мэтадамі работы па Койданаўскім і Вузьдзенскім раёнах, то мы ўпэўнімся, што там праца разгортваецца, як і ў мінулым годзе. Плян хлебазагатовак перадаецца ў кожную вёску і толькі. А далей вясковыя і хлебазагатоўчыя арганізацыі чакаюць, хто колькі дасьць.

Мы добра памятаем, як у мінулым годзе пры арганізацыі чырвоных абозаў кулакі ўсімі мерамі імкнуліся зрываць работу хлебазагатоўчых арганізацый. У вёсцы ў той час на ня быў арганізаваны грамадзкі націск на кулака. Калі мы і цяпер будзем праводзіць хлебазагатоўчую кампанію паранейшаму, то заможнікі свайго хлеба не здадуць, а ў лепшым выпадку здадуць па некалькі пудоў або фунтаў.

Трэба зараз-жа з усёй рашучасьцю адмовіцца ад прымірэнчых настрояў да кулакоў і заможнікаў. Трэба прыцягнуць да хлебазагатоўчай кампаніі ўсю сельскую грамадзкасьць і бядняцка-сераднякі актыў, і пры яго дапамозе прымусіць кулака здаць свае лішкі.

У некаторых раёнах мы ўжо наглядаем грубае скажэньне дырэктывы партыі і ўлады аб хлебазагатоўках. Замест таго, каб зацьвердзіць плян загатовак на сходах беднякоў і сераднякоў, на мясцох проста разьмяркоўваюць заданьне паміж гаспадаркамі па колькасьці ямлі, або па акладных падатковых лістох. Але такі мэтад зьяўляецца ня плянавым правядзеньнем загатовак пры дапамозе бядняцка-сераднякіх мас сялянства, а больш нагадвае харчраскладку. Трэба зараз-жа выправіць дапушчаныя памылкі і з усёй рашучасьцю неадкладна правесьці гэту важнейшую палітычную кампанію. Трэба на справе давесьці правым ухілістым, што тэорыя абвергнута самім жыцьцём. Аб гэтым гаворыць ужо першыя посьпехі, якія мы маем у хлебазагатоўчай кампаніі.

ХЭЎЛІН.

Хлебазагатоўкі на Аршаншчыне пачаліся з спазьненьнем

Бедната і сераднякі неарганізаваны

(Ад нашага аршанскага карэспандэнта)

Хлебазагатоўкі на Аршаншчыне пачаліся даўно. Сялянскі хлеб самацёкам стаў прыбываць на хлебазагатоўчыя пункты. Але акруговыя арганізацыі самі да апошняга часу амаль нічога не зрабілі, каб разгарнуць хлебазагатоўчую кампанію. Толькі тыдзень таму назад акрыканком зацьвердзіў кантрольныя лічбы па хлебазагатоўках і разаслаў іх у раёны, а апошнія па сельсаветах.

Такім чынам, падрыхтоўчая работа па акрузе пачынаецца толькі зараз, толькі цяпер па вёсках праводзяцца сходы сялян, на якіх тлумачацца значэньне і мэтады правядзеньня хлебазагатовак. Усюды бедната і сераднякі выказваюцца за тое, каб здаць свае лішкі дзяржаве. Толькі кулацтва гэта пытаньне абыходзіць маўчаньнем, або заяўляе, што няма лішкаў і няма чаго здаваць. Растлумачальная работа сярод беднаты пакуль што праведзена слаба. Гэта выкарыстоўвае клясавы вораг. Кулакі распаўсюджваюць ілжывыя весткі, што зараз зноў уводзіцца харчраскладка. У некаторых мясцох ім удаецца ўвесьці ў зман беднату. Такі выпадак быў у Салаўянскім сельсавеце, дзе бедната папалася на вудачку заможнікаў і выступіла супроць вызначэньня норм. Гэтаму выступленьню беднаты садзейнічаў сам старшыня сельсавету сваёй памыловай палітыкай. Замест таго, каб гэтыя нормы вызначыў сход сялян, гэта зрабіў старшыня сельсавету, які сам разьмеркаваў нормы здачы лішкаў. Гэта выклікала абурэньне і сярод бядняцкай часткі сялянства. Бедната Аршаншчыны выказваецца за здачу хлебных лішкаў дзяржаве, але яна яшчэ слаба арганізавана вакол хлебазагатоўчай кампаніі, каб сваім грамадзкім уплывам прымусіць кулака здаць свае лішкі. Вось чаму хлебазагатоўкі на Аршаншчыне пакуль што праходзяць слаба, без актыўнага ўдзелу беднаты і вясковых грамадзкіх арганізацый. Толькі з гэтае прычыны хлебазагатоўкі на Аршаншчыне разгортваюцца са значным спазьненьнем. Толькі цяпер усе пачынаюць варушыцца, але ўсё яшчэ слаба.

М—кі.

Чырвоны абоз чакае „растаропных" каапэратараў

Барысаў. (Наш кар.). У нядзелю сяляне Карсакоўскага, Зэмбінскага і інш. сельсаветаў па сваёй ініцыятыве арганізавалі чырвоныя абозы, якія даставілі ў Барысаў звыш 5000 пудоў хлеба. Сяляне прыбылі, ня гледзячы на дрэннае надвор'е і праліўны дождж.

Быў наладжаны шматлюдны мітынг на якім выступалі прадстаўнікі райкому партыі, райвыканкому і сялянства. Мітынг прайшоў пад лёзунгам—«ніводнага пуду хлеба прыватніку, усе лішкі—дзяржаве».

Але не абыйшлося і без непаразуменьняў. Прыгараднае спажывецкае таварыства праявіла вельмі бюракратычныя і нячулыя адносіны да сялянства. Замест таго, каб мабілізаваць увесь свой апарат для прыёму збожжа, на пункце працаваў усяго адзін вагаўшчык. У выніку стварылася вялізная чарга. Ссыпныя пункты былі зачынены а 3 гадз. у той час, калі некаторыя чырвоныя абозы прыбылі а 4, або 5 гадз. Сялянам прышлося доўга чакаць, пакуль «растаропныя» каапэратары адчынілі краму. Вінаватых у нядбайных адносінах да гэтай справы трэба прыцягнуць да адказнасьці.

БАБРУЙСКІЯ МАНЭЎРЫ

Рашуча і актыўна--у наступленьні, упарта і рашуча--у абароне дзейнічалі часьці ў трэцім ходзе манэўраў

Грамадзкія арганізацыі пабаявому спраўляюцца са сваімі задачамі

Намер „сініх" захапіць горад на меў посьпеху

РАЁН МАНЭЎРАЎ, 23. Трэці ход Бабруйскіх манэўрах пачаўся наступленьнем «сініх» в мэтаю захапіць горад, але гэты рух «чырвоныя», атрымаўшы значныя падмацаваньні, хутка спынілі, перайшлі ў наступленьне і, зламаўшы супраціўленьне «сініх», пачалі хутка прасоўвацца, пагражаючы тылу «сініх». У выніку «бою» абодва бакі панесьлі сур'ёзныя «страты», але рашаючага посьпеху ніводзін бок ня меў. Ня гледзячы на дождж і кепскае надвор'е, чырвонаармейцы абодвых бакоў трымаліся добра і праявілі ва многіх выпадках прыклады гэраізму. Характэрна, што чырвонаармейцы абодвых бакоў ня хочуць быць «пераможанымі» і «б'юцца» да канца.

Падрабязнасьці другога ходу манэўраў

РАЁН МАНЭЎРАЎ. Другі ход манэўраў цягнуўся тры дні. Першыя два дні часьці «сіняга» боку вялі наступальныя баі на подступах да вялікай воднай пераправы, а на трэці дзень у начной цемры пачалі фарсаваньне гэтай пераправы. У працягу другога ходу абодвым бакам прышлося весьці баі ў надзвычайна складанай абстаноўцы, вырашаць сур'ёзныя пытаньні манэўраваньнем ў бок флянгаў праціўніка. Шматлікія прыклады баявых дзеяньняў бакоў паказваюць, што камандваньне і ўвесь асабовы склад часьцей у асноўным добра выходзілі з цяжкіх становішч, правільна вырашалі пастаўленыя часьцям задачы, выявілі высокую баявую падрыхтоўку і выявілі вялікую выносьлівасьць. Пантонныя часьці добра працапалі па наводцы мосту праз вялікую водную перашкоду.

У той-жа час на праведзеным разборы другога ходу выяўлены некаторыя недахваты ў дзеяньнях часьцей. Так, адна з часьцей коньніцы «сініх» кепска арганізавала разьведку ў бок флянгу і прашла міма буйных конных часьцей «праціўніка», не заўважыўшы іх Артыле рыя павольна наладжвала кіраваньне. Часамі да яе в боку камандзіраў часьцей прад'яўляліся патрабаваньні, якія немагчыма было выканаць. Былі выпадкі спазьненьня выхаду часьцей у вызначаныя загадам старшага начальніка раёны.

Як станоўчы бок, трэба яшчэ адзначыць хуткую наводку пераправы, некалькі вельмі ўдалых конных атак, праведзеных коньніцай абодвых бакоў, і добрыя дзеяньні авіяцыі, якая рабіла масавыя налёты на пераправы. Палітыка-маральнае становішча войск застаецца на ранейшай вышыні.

Па лініі палітычнай работы ў другім ходзе адзначаны некаторыя недахваты.

На баявой праверцы

У зводным батальёне Асоавіяхіму

Батальён рыхтаваўся да манэўраў ня многа. Ня гледзячы на гэта, дысцыпліна ў батальёне вельмі добрая, выкананьне нарадаў—хуткае, ёсьць вытрымаласьць і выносьлівасьць. Адносіны да насельніцтва—дасканалыя: байцы ветлівыя, шануюць сялянскае дабро, калі дазваляе час—дапамагаюць працаваць, на мясцох стаянкі праводзяць культурна-асьветную работу (батальён мае перасоўчы цір, радыё-ўстаноўку з гучнагаварыцелем, кіно-агіт-фурманку). Сан частка батальёну аглядае сялянскія двары, дзе ёсьць хворыя, піша ім рэцэпты, дае парады, вядзе прафілактычную работу.

Прыхільна сустракае байцоў і насельніцтва. Яны ўжо добра пасябраваліся.

85 проц. байцоў батальёну— моладзь. Яна ў сур'ёзнай рабоце ўпяршыню. Многія яшчэ ня служылі ў арміі. Але з кожным днём усё мацнейшы і разьмераны крок, усё большая ўпэўненасьць у тым, што паход вытрымаем.

Дзяўчат сярод байцоў 10-15 проц. Яны аб'яднаны ў паасобнае стралковае аддзяленьне. Трымаюцца яны ня горш за мужчын: не адстаюць у паходзе, ня скардзяцца на труднасьці. А яны ёсьць. Часамі спазьняецца ў роце абед, няма яшчэ шыпэляў, некаторыя ходзяць у чаравіках на высокіх абсадах, а ў паходзе гэта вельмі нявыгодна.

Адносіны да дзяўчат з боку хлапцоў—таварыскія, без насьмішканьняў.

Душа батальёну—парткалектыў. У ім 117 камуністых. Парткалектыў на агульным сходзе абгаворваў «задачы партыйцаў у паходзе».

Паводзіны байцоў-камуністых узорныя. Ва ўсім батальёне відаць гэта ўзорнасьць.

У кожнай роце ёсьць член бюро парткалектыву, які зьяўляецца ў роце арганізуючым пачаткам. Камсамольцаў у батальёне 230 чал.

Абслужыць матар'яльна як сьлед батальён—справа ня лёгкая. Але трэба сказаць, што ў гэтых адносінах справа стаіць зусім здавальняюча.

Часамі спазьняюцца выдаць хлеб. Батальён суправаджае крама-перасоўка ЦРК.

Мясцовыя вясковыя каапэратывы абслугоўваюць батальён здавальняюча.

Пра здароўе батальёну клапоціцца яго санітарная частка на чале з доктарам П. У санчасьці некалькі лекпомаў (яны раскіданы па ротах), санітараў і санітарак і 2 фурманкі.

Санчастка да прыходу батальёну ў тую ці іншую вёску на раскватараваньне праводзіць «санітарную разьведку», даведваецца, ці няма хворых, аглядаюць студні, дамы.

У батальёне аддзел самакатчыкаў. Яны падтрымліваюць сталую сувязь з галоўным штабам кіраўніцтва, развозяць пакеты, выконваюць абавязкі кватэр'ераў, нясуць службу па разьведцы.

Арганізаваў аддзел самакатчыкаў Менскі Асоавіяхім. Працуюць яны дасканала. Ня гледзячы на кепскую дарогу і адсутнасьць у некаторых хлапцоў ліхтароў, ніводная машына сур'ёзна не сапсавана.

Працаўнікі палітчасьці рыхтуюцца да выпуску паходнай шматтыражкі «Асоавіяхімавец». Некалькі хвілін работы—і на стале першы экзэмпляр. Яго сур'ёзна крытыкуюць: там падліць, тут падмыць, трэба выразьней, больш чытэльна зрабіць. І праз гадзін дзьве байцы, стоячы і седзячы, чытаюць да апошняга радка шэрыя лісткі, атрымліваюць новую зарадку бадзёрасьці.

На дварэ радыстыя нацягваюць антэну, каб паслухаць «абедзенны перапынак» з Масквы. «Агітфурманка» раздае байцом літаратуру. Чытайце, хлопцы, вучэцеся.

Ф. П.

Кіно на манэўрах

Разьмясьцілася аўта-кіно-радыё-перасоўка каля вялікага сяла. Не пасьпелі машыны выбраць месца, а ўжо вакол яе сабраўся значны натоўп. У кабіне і агрэгатным аддзяленьні далі сьвятло ад акумулятара—гэта прыцягнула яшчэ больш народу. Такое дзіва тут упяршыню!

Паміж аўто і ўстаноўленым высокім бумбукавым прутам разгортваецца антэна. Радыё-мэханік ужо злавіў Маскву. Праз рэпрадуктар перадаецца канцэрт з Масквы.

Натоўп з кожнай хвілінай павялічваўся і хутка ператварыўся ў тысячную аўдыторыю. Працаўнікі галоўнага палітычнага кіраўніцтва завязваюць гутаркі і адказваюць на пытаньні сялян. А пытаньняў шмат. Цікавяцца манэўрамі пытаюцца аб калгасах, аб Кітаі.

Каля аўто падрыхтаваны кіно-экран. Роўнамерна запыхцеў рухавік. На экран пырснулі першыя пучкі сьвятла. На даху аўто зьявіўся прамоўца.

— Таварышы, мы вам зараз пакажам карціну, якая раскажа вам аб тым, як павінна перабудавацца наша вёска на сацыялістычны лад.

На экране «Старое і новае»—генэральная лінія партыі на вёсцы.

Гэта новая работа нашых буйнейшых кіномайстроў т. Эйзэнштэйна, Александрава. Цісэ—ідзе першым экранам на Бабруйскіх манэўрах.

У працягу двух з паловаю гадзін карціну глядзелі дзьве тысячы сялян і чырвонаармейцаў.

Сэанс скончыўся. Зноў пытаньні аб сялянскіх справах. Гутаркі аб кіно, аб радыё, аб неабходнасьці хутчэйшага ўкараненьня кіно і радыё ў вёску.

Як прыязнацца многія сяляне яны ўпяршыню слухаюць радыё, упяршыню бачаць кіно.

Пасьля кіно па просьбе сялян, зноў даваліся радыё-перадачы. Слухалі Маскву, потым Нямеччыну.

Чырвоная армія праз аўтакіно правяла ў гэты вечар вялікую палітычную работу сярод сялянства.

Практыка работы аўта-кіно-перасоўкі на Бабруйскіх манэўрах гаворыць аб магчымасьці шырокага скарыстаньня аўта-кіно-перасовак для палітычнай работы сярод арміі і насельніцтва.

Раён манэўраў. М. СЫЧАЎ.

Радыстыя дзейнічаюць

У гэтым годзе Менская сэкцыя кароткіх хваль атрымала магчымасьць праверыць ці ў стане яна абслугоўваць радыё-сувязьзю батальён Асоавіяхіму на паходзе.

Манэўры аказаліся для яе самым адпаведным выпадкам.

На работу выйшлі чатыры менскія кароткахвалявікі-практыканты на чале з т. Макавецкім (Р. К.—68), якія працуюць з кароткімі хвалямі з пачатку 1927 г.

Перадатчык дала Менская сэкцыя. Транспартныя сродкі і прылады для перадатчыка—Цэнтральны Савет Асоавіяхіму БССР.

Вузкапрактычнай карысьці для зводнага батальёну Асоавіяхіму, да якога быў прымацаваны перадатчык, радыстыя ня прынесьлі: у батальёне ня было другога перадатчыка і таму перагаворвацца ня было з кім. Да таго перакіданьне батальёну з аднаго месца на другое перашкаджала радыстым грунтоўна ўзяць у работу перадатчык, праверыць рад пытаньняў, зьвязаных з яго спробаю.

Радыстыя навучыліся строга разьмяркоўваць паміж сабою ролі, устанаўляць перадатчык у працягу 8-10 хвілін (у першыя дні на гэта траціла паўгадзіны).

Радыстыя зьвязаліся з Масквой, Ленінградам і Кіевам. З Менскам сувязі ўстанавіць не ўдалося, але магчымасьці для гэтага бязумоўна ёсьць.

Таварышы вельмі здаволены сваёй работай на манэўрах і вынесьлі з іх добры практычны ўрок.

В.

У сувязі з манэўрамі на старонках «Зьвязды» быў зьмешчан рад нарысаў па вайсковым тэмы, якія далі магчымасьць чытачу азнаёміцца з асновамі сучаснай ваеннай справы.

У даным артыкуле мы хочам асьвятліць пытаньне палітычнай работы ў РСЧА — гэтага «спэцыяльнага роду зброі», як кажа т. Бубноў.

Пастаноўка данага пытаньня абумоўліваецца як рашаючым значэньнем памянёнага «роду зброі», так і практычнай неабходнасьцю дакладнага прадстаўленьня аб ім усіх тых, хто мае дачыненьне да Чырвонай арміі.

Палітычная работа ёсьць работа партыі на кіраўніцтве Чырвонай арміяй. «Палітработа — функцыя партыі ў арміі».

Адгэтуль ужо ясна, што сутнасьць і значэньне палітработы далёка ня вычэрпваецца палітыка-асьветнай справай, да якое яшчэ ня рэдка зводзіцца ў некаторых прадстаўленьне аб ёй.

Палітработа — сума ўсіх мерапрыемстваў партыі, як кіраўніка ўзброеных сіл пралетарскае дзяржавы.

Палітработа — адзіная. Адначасова яна мае дзьве важнейшыя сустаўныя часткі, дзьве генэральныя лініі: арганізацыйна-кіруючая работа і агітацыйна-прапагандысцкая. Другая, у сваю чаргу, падзяляецца на ўнутрыпартыйную, палітыка-асьветную і культурна-асьветную.

Арганізацыйна-кіруючая работа знаходзіць сваё канкрэтнае выражэньне ў забесьпячэньні лініі партыі ва ўсім будаўніцтве ўзброеных сіл, у кіраўніцтве палітворганаў работай армейскай партарганізацыі ў падбо[illegible]ры кадраў працаўнікоў, забесьпячэньні нармальнага палітыка-маральнага стану часьцей і г. д.

Агітпроп-работа мае сваім асноўным зьместам палітычнае выхаваньне чырвонаармейцаў, задачы якога зводзяцца да выпрацоўкі сьвядомага, баяздольнага абаронцы савецкае ўлады. Выхаваньне і навучаньне чырвонаармейца ідзе па трох асноўных галінах, па трох кірунках, якія маюць пэўную пасьлядоўнасьць у часе — гэта: ваянізацыя, саветызацыя, інтэрнацыяналізацыя. Па гэтых пэрыядах праводзяцца ў адзінай сыстэме ўсе віды работы, як школьная, па-зашкольная, ваенкораўская і інш.

Уся палітычная падрыхтоўка байца падпарадкоўваецца задачы росту яго клясавай сьвядомасьці. Праграма партыі кажа, што «работа вайсковага навучаньня і выхаваньня Чырвонай арміі праводзіцца на падставе клясавага згуртаваньня і сацыялістычнае асьветы».

Да чаго-ж зводзіцца асноўная задача ўсёй палітработы? Яна выцякае з тых задач, якія партыя ставіць у адносінах арміі. Чырвоная армія — узброеная апора пралетарскай дыктатуры. Яе прызначэньне — «быць у стане супроцьстаць нават усяму капіталістычнаму сьвету», як казаў т. Фрунзэ. Адгэтуль канкрэтная задача палітработы ў арміі — узмацненьне яе баяздольнасьці.

Але што разумець пад баяздольнасьцю ў свой час на гэтым пытаньні было даволі спрэчак і меркаваньняў. Можна знайсьці яшчэ і зараз людзей, якія разглядаюць баяздольнасьць, як вайсковую вывучку чырвонаармейца плюс добрае ўзбраеньне. Ці можна, напрыклад, назваць баяздольнай часьцю такую, якая адважна змагаецца за аўладаньне горадам з тым, каб яго потым разрабаваць? Знаходзіліся людзі,, якія такую часьць лічылі баяздольнай і стараліся на прыкладах грамадзянскае вайны гэта пацьвердзіць. Зразумела, гэты погляд зусім няправільны і шкодны.

Чырвоная армія — адбітак пралетарскае дзяржавы. Яе прырода азначаецца клясавай сутнасьцю апошняе. Пустым фантазэрствам зьяўляюцца разважаньні аб баяздольнасьці «наогул». Няма такой у прыродзе. Ёсьць баяздольнасьць для клясы. Чырвоная армія — зброя клясавага панаваньня пралетарыяту і баяздольна толькі тады, калі можа абараняць інтарэсы рабочае клясы. Адгэтуль зусім зразумела, што баяздольнасьць Чырвонай арміі складаецца з двух элемэнтаў: ваенна-тэхнічнай магутнасьці і палітычнай сьвядомасьці складу арміі. [illegible]лькі злучэньне гэтых двух бакоў робіць армію баяздольнай.

Задачы ўзмацненьня баяздольнасьці падпарадкоўецца як арганізацыйная пабудова, так зьмест і формы палітработы. Камуністы, які знаходзіцца ў арміі, будзе выконваць добра свае абавязкі толькі тады, калі ён будзе, апрача бальшавіцкае вытрыманасьці, уладаць ведамі ваеннае справы і дысцыпліванасьцю. Партыйная дысцыпліна, ва ўмовах арміі, павінна служыць сродкам узмацненьня вайсковай дысцыпліны.

Вось коратка сутнасьць і задачы палітработы. З усяго вышэйпаданага відаць, што палітычная работа мае рашаючае значэньне ў сыстэме кіраўніцтва і выхаваньня Чырвонай арміі. Іменна палітработа абарачае яе ў армію пралетарскай рэвалюцыі, у апору дыктатуры пралетарыяту. Зусім зразумела, што пры аднолькавых даных у ваенна-тэхнічных адносінах пераможа тая частка. склад якое ўладае больш высокімі маральнымі якасьцямі. Усімі прызнана, што пры ўсіх вялізным значэньні тэхнікі, «перамагае, урэшце, чалавек». Вялізнае значэньне маральнага фактару не адмаўляюць і буржуазныя стратэгі. Недарма буржуазія прымае ўсе меры да выхаваньня ў салдата нацыянальна-патрыётычных пачуцьцяў, імкнецца, на глебе сацыяльна-палітычнага ашуканства, разьвіць у яго волю да перамогі.

Ясная клясавая ідэя, давер'е да свайго кіраўніцтва, якія складаюць аснову маральнага фактару ў Чырвонай арміі, зьяўляюцца нашай вялізьнейшай перавагай у параўнаньні з любой арміяй капіталістычных дзяржаў.

Кіруючае значэньне палітработы, зразумела, зусім не вымяншае ролі ваенна-тэхнічнае магутнасьці арміі, яе страявой падрыхтоўкі і інш. Мы ўжо гаварылі, што толькі сума гэтых двух элемэнтаў гарантуе баяздольнасьць арміі.

Аб далейшых шляхох разьвіцьця кіно-дзейнасьці ў БССР

Трэба ўзяць пад большы кантроль і разгорнутую самакрытыку дзейнасьць Белдзяржкіно

ЗМАГАЦЦА ЗА ІДЭАЛЁГІЧНУЮ ЧЫСТАТУ ПАСТАНОВАК.

„Кіно гэта цэлая ідэалёгічная лябараторыя для працоўных мас, дзе фармуецца ідэалёгія ў значна большым маштабе, чым у любой школе на любым сходзе" (М. ГАЛАДЗЕД)

Разгорнутае сацыялістычнае наступленьне, што адбываецца зараз, і зьвязанае з гэтым абвастрэньне клясавай барацьбы вострa ставіць перад партыяй ня толькі пытаньні гаспадарчага парадку, але таксама і ўсе многагранныя праблемы ідэалёгічнага фронту. У галіне вышэйшай навукі і школы першай ступені, тэатру і кніжнае справы, літаратуры і ліквідацыі няпісьменнасьці партыя вядзе рашучую барацьбу за пралетарскія пазыцыі, выганяючы адусюль уплыў буржуазных і дробнабуржуазных элемэнтаў.

Выспрэчным зьяўляецца той факт, што ў барацьбе на ідэалёгічным фронце кіно адыгрывае далёка не апошнюю ролю. Наадварот, вялікае пашырэньне кіно-сеткі і бязупынны рост наведвальнікаў кіно, што адбываецца як па ўсім Саюзе, так і ў БССР, робяць кіно важнейшай зброяй у справе выхаваньня самых шырокіх мас, у справе барацьбы за новы быт, за новую культуру. Недармa Ленін ня раз зьвяртаў увагу партыі на гэта вялікае з вялікіх мастацтваў.

Ясна, што як і на іншых вучастках ідэалёгічнага фронту, так і ў галіне кіно мы маем побач з дасягненьнямі прарывы і недахопы.

Калі мы возьмем нашае беларускае кіно, то мы тут павінны будзем забіць трывогу і з поўнай яснасьцю заявіць, што ў гэтай галіне ў БССР мы маем сур'ёзны прарыў. Белдзяржкіно, па нашай думцы, ня выконвае ў здавальняючай меры тэй ролі, якая ўскладаецца на яго пэрыядам сацыялістычнага перабудаваньня нашай краіны. На недахопы работы Белдзяржкіно ўжо ня раз зьвярталася ўвага савецкай грамадзкасьці (хаця-б кіно-дыспуты, газэтныя рэцэнзіі) і нашых арганізацый, але з кожным новым выпускам прадукцыі беларускага кіно прыходзіцца ўсё гучней узьнімаць голас аб далейшых шляхох разьвіцьця кіно-дзейнасьці ў БССР.

Мы гэтымі днямі бачылі апошнюю карціну выпуску Белдзяржкіно **«ДЖЭНТЛЬМЭН і ПЕВЕНЬ»**. Трэба проста сказаць, што большай агіднасьці і глупства нельга ўявіць на кіно-экране. Карціна чамусьці завецца камэдыяй, хаця нічога, апрача суму, злучанага з прыкрасьцю за патрачаныя дарэмна на яе сродкі, яна не выклікае. Надзвычайна плоскі сюжэт: польскага пана трывожащь пеўні, ён парашыў іх зьбіць, але... на савецкім баку таксама ёсьць пеўні, а апрача іх яшчэ і пінэры, якія пяюць рэвалюцыйныя гімны і... прымушаюць пана выехаць у глыб Польшчы. Сьмяяцца з ворага—рэч карысная, патрэбная. Але спробы Белдзяржкіно ў гэтай карціне даць шарж на ворага праваліліся. Наадварот, бадай, у карціне ёсьць некаторае заміланьне жыцьцём шляхецкага двара. Савецкае пагранічча выяўлена з нязвычайнай падсалоджанасьцю. Пінэры, малюцца «пікантна» прыбранымі, як панічы, у аднолькавых шапачках, бясклопатна маршыруюць, гуляюць, пяюць...

Пастух адтуль, зразумела, пераходзіць на савецкі бок, за ім, зразумела, пераходзіць і яго каханка. Усё гэта штучна, алянавата, надумана, бяз усякага сэнсу. Адзінае, што яна можа зрабіць—гэта агітаваць **супроць** савецкага кіно. Пацікаўцеся рэагаваньнем глядача на карціну—яно (рэагаваньне) выключнае па сваёй аднадушнасьці—нікудышная, сумная, безъвымястоўная і пустая карціна. «Ідэалёгія» карціны падсалоджаная. Фільм дае зусім няправільнае, фальшывае паказаньне савецкіх будняў, ён зьяўляецца няўдалай спробай «зрабіць» савецкую камэдыю.

Але калі на крытыку гэтай карціны кіраўнікі Белдзяржкіно могуць пярэчыць нам паказаньнем, што яна не зьяўляецца сур'ёзнай вытворчасьцю творцаў Белдзяржкіно, мы можам паказаць на другую карціну нядаўняй вытворчасьці **«ДА ЗАЎТРА»**. Гэта вялікая карціна і, як відаць, вялікая спроба вывяўць нацыянальна-вызваленчую барацьбу ў Заходняй Беларусі. Спроба, якая заслугоўвае ўсякай пахвалы. Але трэба сказаць проста, што спроба не ўдалася, а палітычна карціна «Да заўтра» зьяўляецца шкодная карцінай.

Бяручы групу вучнёўскай моладзі, як паказальніка тэй гэраічнай барацьбы, якую вядуць працоўныя масы Заходняй Беларусі за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне з-пад фашысцкага гнёту, аўтары карціны як-бы працавалі па-за тымі падзеямі, якія адбываліся за апошнія гады на З. Беларусі. У іх кіраўнікі гімназіі (ці не Астроўскага яны думалі!)—гэта барацьбіты, хай умеркаваныя, але ўсё-ж барацьбіты супроць акупацыі. Час ужо ведаць, што тая частка інтэлігенцыі, якая стаяла на чале гімназіі, даўно ўжо знаходзіцца ў лягеры фашызму і жорстка распраўляецца з рэвалюцыйнай вучнёўскай моладзьдзю. Для аўтараў карціны барацьба рэвалюцыйнай вучнёўскай моладзі праходзіць па-за ўсякай сувязьзю з барацьбой працоўных мас Заходняй Беларусі, хаця іменна гэтае апошняе параджала сьмелыя і адважныя выступленьні моладзі.

А хіба-ж няўдалымі зьяўляюцца толькі гэтыя два апошнія выпускі Белдзяржкіно? Хіба **«ХВОІ ШУМЯЦЬ»** не правалілася і не спаткала халодных адносін з боку рабочага глядача, дзякуючы сваёй надуманай пінкэртоўшчыне, палітычнай бескаляроваcьці і безъвымястоўнасьці. А хіба-ж навет «300 мільёнаў» адпавядала таму вялікаму шуму, які быў узьняты вакол яе кінорэклямай?

І вось паўстае ўжо пытаньне не аб якой-небудзь адной, асобнай карціне, а аб усей дзейнасьці Белдзяржкіно, аб палітычным зьместе яго выпускаў, аб палітычным кіраўніцтве гэтым вучасткам ідэалёгічнага фронту, аб лініі і ўстаноўцы яго далейшай работы. Апошнія дзьве карціны гаворыць, што БДК, напершае, ня рухаецца наперад па шляху паляпшэньня зьместу сваіх карцін, падругое, яго прадукцыя церпіць ад палітычнай нявытрыманасьці, якая рэзка кідаецца ў вочы, патрэцце, сваёй работай БДК праходзіць міма ўсяго сучаснага жыцьця і яго вострых, палкіх праблем, пачаўшы вертае, бяручыся за выяўленьне рэвалюцыйнай барацьбы захаду, БДК прадстаўляе яе ў скажоным, палітычна няправільным выглядзе, і таму прыносіць больш шкоды, чым карысьці. Буйныя палітычныя памылкі ў рабоце БДК (нацыянал-дэмакратызм у карціне «Да заўтра») гаворыць, што час ужо больш рашуча паставіць пытаньні кіно і кіраўніцтва ім.

Трэба паставіць пытаньні аб паляпшэньні і ўзмацненьні ідэалёгічнага кіраўніцтва дзейнасьцю БДК з боку Наркамасьветы і партыйных арганізацый. Кіраўніцтва гэта з боку Наркамасьветы было надзвычайна слабым, часта няправільным і зусім не адпавядала тэй ролі, якую кіно адыгрывае ў нашым жыцьці. Толькі пры такой слабой увазе і слабым кіраўніцтве маглі траціцца сродкі на непатрэбную бязглузьдзіцу, накшталт «Джэнтльмэн і певень», і зьяўляцца карціны з нацыянал-дэмакратычным душком, накшталт «Да заўтра».

Трэба ўзяць пад большы кантроль і больш шырокую і разгорнутую самакрытыку рабочага глядача дзейнасьць Белдзяржкіно.

Змагаючыся за ідэалёгічную чыстату пастановак Белдзяржкіно, дапамагаючы яго вялікай рабоце, забясьпечваючы правільнае партыйнае кіраўніцтва, мабілізуючы вакол яго прадукцыі шырокую бальшавіцкую крытыку, мы будзем, як і раней, даваць рашучы адпор усялякай «крытыцы» варожа клясавых элемэнтаў.

Трэба наблізіць кіраўнікоў гэтай арганізацыі да шырокіх мас рабочага і сялянскага глядача. Трэба правяць сур'ёзную ўвагу да далейшых планаў і выпускаў, што рыхтуюцца Белдзяржкіно. Справа гэта заслугоўвае сур'ёзнае ўвагі партыі і ўсёй рабочай грамадзкасьці.

Час сур'ёзна ўзяцца за рэарганізацыю кіно-справы і ў нас, у БССР.

ЯНУШКЕВІЧ.

МЕНСК

Працоўныя Менску рыхтуюцца да спатканьня Чырвонай арміі

Працоўныя Менску рыхтуюцца да ўрачыстага спатканьня часьцей Чырвонай арміі, якія варочаюцца з манэўраў. Горад будзе ўпрыгожвацца зеляніной. Вуліца Карла Маркса, па якой будуць праходзіць чырвонаармейскія часьці, будзе ілюмінавана. Рад рабочых арганізацый рыхтуюць падарункі для Чырвонай арміі.

Сёньня ў Доме Культуры на пленуме менскага гарсавету народны камісар па ваенных і марскіх справах т. ВАРАШЫЛАЎ выступіць з дакладам аб міжнародным і ўнутраным становішчы СССР.

Гарсавет разьмеркаваў па прафсаюзах для ўваходу ў Дом Культуры каля 600 білетаў.

Праезд тав. Даўгалеўскага

Праз Менск праехаў у Парыж паўнамоцны прадстаўнік СССР ва Францыі тав. Даўгалеўскі.

Пасыўныя дэлегаты выключаны з гарадзкога савету

За сыстэматычнае неаведваньне пасяджэньняў пленумаў і сэкцый гарадзкога савету мандатная камісія пастанавіла вывесьці са складу гарадзкога савету загадчыка акрфа т. Воотрыкава і старшыню Вучкпрафсожа МББ чыг.—тав. Дзьмітровіча. Выбаршчыкам будзе прапанавана пераабраць гэтых дэпутатаў.

Магутнасьць Асінаўскай электрастанцыі пашыраецца на 12.000 кілёват

«Энэргстрой» зацьвердзіў дагавор з Асінбудам на распрацоўку праекту пашырэньня Асінбуду дадаткова на 12 тыс. кілёват.

Новы расклад цягнікоў

У расклад цягнікоў уносяцца зьмены. З 2-га лістапада курсаваньне цягнікоў Менск—Харкаў скарачаецца да 4-х разоў у тыдзень. Цягнікі будуць адпраўляцца па нядзелях, панядзелках, сэрадах і пятніцах.

Спыняецца курсаваньне курортных вагонаў. Вагон Менск—Мінэральныя воды ў апошні раз выедзе з Менску 5-га кастрычніка, а вагоны Менск—Сэвастопаль і Менск—Ёўпаторыя—8-га кастрычніка.

Заняткі ў БДУ пачнуцца 1-га кастрычніка

Праўленьне БДУ пастанавіла пачаць заняткі на ўсіх факультэтах з 1-га кастрычніка. Зімовы перапынак устанаўляецца з 16-га па 31-га студзеня 1930 году. Заняткі скончацца 15-га мая.

Як паступае с.-г. падатак

Па даных НКФ на 15 верасьня, па БССР паступіла сельска-гаспадарчага падатку 2.527 тысяч рублёў, а разам з надоймкамі і пеняй—2.573 тысячы руб. На першым месцы па зборы с.-г. падатку ідзе Менская акруга, дзе паступіла 602 тысячы руб., на другім месцы—Магілёўская, даўшая 416 тысяч руб. на апошнім Полацкая—142 тыс. руб.

Падрыхтоўка кваліфікаванай рабочай сілы

Будуць адкрыты новыя прафтэхнічныя школы і курсы

Яшчэ ў пачатку гэтага месяца справа з пастаноўкай прафтэхнічнае асьветы культгала на абедзьве нагі. Прадпрыемствы і трэсты ўпарта сабатавалі дзесяткі пастаноў адпаведных органаў аб стварэньні неабходных да зарэзу школ фабзавучу.

Гэта прымусіла трох членаў бюро ЦК камсамолу (т. т. Галавача, Джэлюка і Шаліма) зьвярнуцца з адкрытым лістом да кіруючых органаў і прасіць пакласьці канец бюракратычным адносінам гаспадарнікаў да пытаньняў падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых сілы.

У лісьце, між іншымі, падаваўся рад канкрэтных фактаў нязвычайнай цяганіны некаторых трэстаў у справе стварэньня школ ФЗВ. Напрыклад, цяганіна з пабудовай школы фабзавучу Лесбелу—цягнецца **3 гады** (!!), школы фабзавучу мэталістых у Віцебску—8 месяцаў. Памяшканьня для школы няма, абсталяваньня амаль ніякага, падручнікаў няма і г. д.

«Такія адносіны да вялікай справы,—правільна адзначае ліст,—**ставяць пад пагрозу зрыву намечаныя пяцігоднай мерапрыемствы, зрываюць бягучы навучальны год у школах ФЗВ».**

18-га верасьня пры НК РСІ пад старшынствам нам. наркома РСІ тав. **Рыскіна** адбылася нарада прадстаўнікоў трэстаў і зацікаўленых арганізацый. Пытаньне аб падрыхтоўцы кваліфікаваных сіл было пастаўлена рубам. Гаспадарнікі паспрабавалі апраўдацца «аб'ектыўнымі ўмовамі». Але гэта ім не ўдалося. Прышлося намеціць дакладна тэрміны для адкрыцьця школ ФЗВ.

Па заяве прадстаўніка Мэталятрэсту **тав. Любамірскага** школа фабзавучу ў Віцебску пачне працаваць сваячасова—з 1 кастрычніка г. г. Прадстаўнік Лесбелу **т. Дварэцкі** заявіў, што пабудова школы фабзавучу ў Бабруйску будзе весьціся ў далейшым паскораным тэмпам і да 1-га студзеня 1930 году будзе скончана. А пакуль што часова заняткі будуць адбывацца ў другім памяшканьні.

Прадстаўнік Швэйтрэсту **тав. Ерэнбург** таксама запэўніў, што школа фабзавучу ў Віцебску пачне працу не пазьней 15 кастрычніка г. г., а ў Менску—не пазьней 1-га лістапада г. г.

Што датычыць Скуртрэсту, які ўвесь час ухіляўся ад арганізацыі фабзавучу, тут прышлося перамагчы ня толькі нежаданьня, але і няправільны погляд на школу ФЗВ у грабарнай прамысловасьці. Скуртрэст чамусьці лічыць, што кваліфікацыі гарбара нядоўга навучыцца і што наогул рабочай сілы для Скуртрэсту хопіць.

Гэта прымусіла нараду вылучыць камісію для азнаямленьня са становішчам школы ФЗВ пры гарбарні «Бальшавік» і выявіць магчымасьць новага набору вучняў у гэтым годзе.

Адносіны-ж Скуртрэсту да гэтага пытаньня нарада ахарактарызавала, як **недапушчальныя.**

Трэба спадзявацца, што гэта нарада паслужыць пераломным момантам у адносінах да пытаньня аб прафтэхнічнай асьвеце.

Такі-ж пералом намячаецца і ў самым ВСНГ. Гэтымі днямі мы паведамлялі аб пастанове прэзыдыуму ВСНГ поўнасьцю ажыцьцявіць пастанову СНК аб адкрыцьці прафтэхкурсаў на тых прадпрыемствах, дзе ёсьць звыш 20-ці бронь-вучняў. Усяго мяркуецца адкрыць 37 новых прафтэхкурсаў. Пастанова вельмі і вельмі добрая.

Але мы ведаем, як трэсты і прадпрыемствы часамі выконваюць дырэктывы ВСНГ, асабліва калі справа датычыць прафтэхнічнае асьветы.

Прафсаюзы і камсамольскія арганізацыі павінны ўзяць пад пільны кантроль разьвіцьцё прафтэхнічнае асьветы і дабіваца таго, каб пастановы ВСНГ у гэтай галіне і абяцанкі трэстаў былі абавязкова праведзены ў жыцьцё.

П.

МІЛЬЁН РУБЛЁЎ ЭКАНОМІІ

Аб'яднаньне Заходніх, Маскоўска-Варонескай і Сызрана-Вяземскай чыгунак

З 1-га кастрычніка Заходняя чыгунка аб'яднаюцца з Маскоўска-Варонескай і Сызрана-Вяземскай чыгункамі.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам член аргкамісіі ЦК саюзу чыгуначнікаў тав. **Пракаповіч** паведаміў аб задачах аб'яднаньня.

— Аб'яднаньне чыгунак дасьць магчымасьць значна зьнізіць накладныя выдаткі і палепшыць кіраўніцтва сеткаю чыгунак.

Па прыблізных падліках, аб'яднаньне адных толькі праўленьняў чыгунак павінна даць эканомію ў мільён рублёў у год.

Значныя вынікі дасьць таксама і рэарганізацыя лінейнага апарату (узбуйненьне вучасткаў пуці, руху і г. д.).

Уся падрыхтоўчая работа па аб'яднаньні дарог ужо скончана. Апараты праўленьняў Заходніх і Маскоўска-Варонескіх чыгунак згортваюцца, у іх накідаюцца толькі ліквідацыйныя часткі.

З агульнага штату праўленьня Заходніх чыгунак у 660 ч.—232 супрацоўнікі пераводзяцца на работу ў Калугу. 279 супрацоўнікаў застаюцца пакуль што ў ліквідацыйнай частцы ў Гомелі.

Пытаньне аб рэарганізацыі лінейнага апарату будзе прапрацоўвацца пасьля 1-га кастрычніка пры актыўным удзеле рабочых мас.

5-га кастрычніка ў Калузе склікаецца аб'яднаны дарожны зьезд па пытаньні аб перабудове работы вучкпрафсожаў Спачатку ў Жлобіне і ў Гомелі адбудуцца вучастковыя зьезды чыгуначнікаў.

Гэтымі днямі Белбюро ЦК чыгуначнікаў заслухала інфармацыю аб ходзе падрыхтоўкі да аб'яднаньня чыгунак.

Белбюро канстатавала рад недахопаў у гэтай рабоце. Ня было сувязі паміж аргкамісіяй ЦК саюзу і Белбюро. Пытаньне аб аб'яднаньні ня было пастаўлена на сходах рабочых. Прадстаўніку аргкамісіі дан рад указаньняў.

М. К.

За 2 тыдні паступіла звыш 6 міл. руб. падаткаў

Кампанія за сваячасовае спагнаньне падаткаў, узьнятая „Зьвяздой", дала вяпікія вынікі

У гутарцы з нашым супрацоўнікам адказныя працаўнікі НКФ БССР адзначылі, што кампанія за сваячасовае паступленьне падатковых прыбыткаў, якую разгарнула «Зьвязда», дала ўжо рэальныя вынікі. За верасень павінна было паступіць 9 мільёнаў руб. падатку.

На 15-га верасьня паступіла звыш 6 млн. руб. Весткі з месц гаворыць аб тым, што ў справе паступленьня падаткаў адбыўся пэўны пералом. Да 1-га кастрычніка за ўвесь верасень павінна было паступіць 3 млн. руб. с.-г. падатку, да 15-га верасьня ўжо ёсьць 2.700.000 руб.

Па прамысловым падатку павінна было паступіць каля 3 млн., за поўмесяца паступіла звыш 2 млн. руб.

Ліквідуецца старая падатковая запазычанасьць аграмаджанага сэктару. Таксама прыняты меры да ліквідацыі запазычанасьці прыватнага сэктару.

Прадстаўнікі НКФ лічаць, што зрух адбыўся, дзякуючы, галоўным чынам, энэргічнай кампаніі, праведзенай газэтай «Зьвязда». Газэта мабілізавала савецкую грамадзкасьць наўкола гэтай справы і падцягнула асобных працаўнікоў, якія пасьўна адносіліся да гэтай важнейшай работы. Вялікую ролю адыграла тут і больш суровая карная палітыка судовых органаў.

З ЛІСТОЎ РАБСЕЛЬКОРАЎ

БАЯЦЦА САМАКРЫТЫКІ

«Ведаючы» піша, што мясцком ст. Рудзенск, Заходняй чыг., **хавае інтарэсы рабочых у кішэні і вельмі «баіцца» самакрытыкі** з боку рабочых і служачых чыгункі. Мясцком перашкаджае выпуску другога нумару насьценгазэты, якая вісіць яшчэ з 1-га мая, у той час, калі ў рэдкалегіі ёсьць многа матар'ялу.

ТРЭБА ПАДШТУРХНУЦЬ РАЙКОМ

Селькор Алесь Бяздольны піша ў сваім допісе, што ў лютым месяцы гэтага году ў Магілёўскай акруговай газэце «Магілёўскі Селянін» быў надрукаваны фэльетон пад загалоўкам «Напляваць», дзе пісалася аб хібах у працы былога сакратара парт'ячэйкі **Агеенкава.** Рэдакцыя перадала гэты фэльетон Лупалаўскаму РК КП(б)Б, але-ж да гэтага часу ніякіх вынікаў няма.

ПОЛАЦКІ АКРВЫКАНКОМ—АДКАЖЫ

Цэнтральная дзіцячая камісія пры ЦВК БССР ня раз зварачалася да Полацкага акрвыканкому аб аказаньні дапамогі Полацкай акруговай дзіцячай камісіі. З свайго боку цэнтральная камісія аказвае ўсямерную дапамогу, адпускаючы датацыі на барацьбу з дзіцячай бяспрытульнасьцю ў Полацкай акрузе, але чамусьці Полацкі акрвыканком ня хоча дапамагчы. Цэнтральная дзіцячая камісія просіць Полацкі акрвыканком ужыць захады, каб вызваліць полацкую дзіцячую камісію ад выплаты 1.200 руб. арэндай платы за шавецкую майстэрню, дзе навучаюцца бяспрытульныя дзеці. Можа газэта «Зьвязда» дапаможа ў гэтай справе.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

У чацьвер, 26 верасьня г.г. а 7-й гадз. увеч. у памяшканьні акруткому МОПР'а (Савецкая, 87) адбудзецца пленум Фрунзаўскага Раённага Камітэту МОПР'а.

Запрашаюцца члены пленуму абраныя на адбыўшайся ў верасьні раённай канфэрэнцыі МОПР'а.

А 6 гадз. там-жа пасяджэньне камфракцыі.

— **БДУ.** Сёньня, 25 верасьня, а 6 гадз. увечары ў 41 аўд. адбудзецца агульны сход выпускнікоў Праўгасу па пытаньні аб выпуску.

Яўка абавязкова.

— **Дом камуністычнае Асьветы імя Карла Маркса.** Сёньня кіно «Хвоі гамоняць». Пачатак а 8 і 10 г. увеч. Білеты для членаў КП(б)В, ЛКСМ і іх сем'яў у касе Дому, а 6 г. увеч.

Працягваецца перавучот чытачоў біб-кі. Тыя, што ня зьявяцца, будуць лічыцца выбыўшымі.

— **БДУ.** Сёньня, 25 верасьня, а 6 гадз. увечары ў габінеце рэктара БДУ (Земляробскі зав. 4) адбудзецца нарада па разьмеркаваньні акадэмічных гадзін на будучы навучальны год.

Запрашаюцца наступныя т. т.: Рыўлін, Башкевіч, Канаплін, Усьпенскі, Лур'е, Пікус, Каган, Расін, Вайнштэйн, Валабрынскі, Выдра, Сякерская, Галанза, Тамашэвіч, Буткевіч.

— **БДУ.** Даводзіцца да ведама студэнтаў хэмтэхфаку, што з 24 па 30 верасьня адбудзецца рэгістрацыя апошніх з мэтаю арганізацыі прафсэкцыі хэмікаў. Рэгістрацыя адбудзецца ў будынку мэдфаку ў пакоі № 33 ад 4—6 гадз. дня.

— **Дом Асьветы.** Сёньня, 25 верасьня, роўна а 4-й гадз. дня адбудзецца нарада сакратароў групкомаў і МК з удзелам гарадзкога прафактыву саюзу працасьветы.

Парадак дня: Аб парадку правядзеньня перавыбараў саюзных органаў.

Яўка ўсіх—абавязкова і без спазьненьня.

Камісія па чысцы беспрацоўных Менскай біржы працы паведамляе беспрацоўных, што знаходзяцца на разумовай сэкцыі, што 26 верасьня ў чацьвер, а 9 гадзіне ўвечары будуць абвешчаны вынікі праверкі сэкцыі.

Камісія.

— Райпраўленьне пэфтаварыства Кастрычнікавага раёну паведамляе, што ў сераду 25-га верасьня г. г. роўна а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні залі Менакруткому КП(б)Б адбудзецца пашыраны актыў, на якім павінны ў абавязковым парадку прысутнічаць усе члены выканбюро пэфтаварыства і члены сэкцыі.

Пра адну ўстаноўку

На даным этапе партыя зьвярнула асаблівую ўвагу на пытаньні культурнага будаўніцтва. Беларуская літаратура, гісторыя, асобныя літаратурныя арганізацыі, літаратурныя творы, ступень іх адпаведнасьці патрабаваньням партыі служаць прадметам абмеркаваньня шырокіх працоўных мас.

Аднак, ёсьць адзін важны вучастак культурнага будаўніцтва, аб якім яшчэ пакуль што пытаньня не падымалася. Гэты вучастак—беларуская літаратурная мова, беларуская навуковая тэрміналёгія.

Стварэньне беларускае навуковае тэрміналёгіі стала канечна патрэбным толькі пасьля Кастрычнікавае рэвалюцыі.

У выніку работы спэцыяльных камісій пры б. Інбелкульце мы маем рад выпускаў беларускае навуковае тэрміналёгіі па розных галінах.

Праглядаючы апошнія выпускі (ня кажучы пра першыя шэсьць, беларускае тэрміналёгіі, заўважаецца поўная ўстаноўка, поўная накіраванасьць: пры адсутнасьці патрэбных слоў у народнай мове, бяруцца словы з польскае мовы.

Возьмем прыклады. Перад намі тэрміналёгія грамадазнаўства (выданьне Інбелкульту, Менск, 1927 г.). Шырока вядомае слова «эксплёатацыя» ў гэтай тэрміналёгіі перадаецца словам «вызыск» (2013), эксплёатаваная кляса—«вызысканая кляса» (683), эксплёатацыя—«выправа» (1007), эксплёатацтва—«еднасьць» (479), гарнізон—«залога» (382), людна сьць (969), дажывотны (1267) і інш.

У матэматычнай тэрміналёгіі (выд. Інбелкульту, Менск, 1927 г.) чытаем: «рэчаісты, нерэчаісты (1344), дзедзіна (1469), стасунак (1589), прыпускаць, прыпушчэньне (2003).

У глебазнаўчай тэрміналёгіі і сельска-гаспадарчай: «первясковае (282), згрмаджэньне (660), конь высьцігоны (1370).

Калі да ўсяго пералічанага дадаць такія шырока ўжываныя сказы, як «сход адбудзецца а такой і такой гадзіне», «я ёсьць тым чалавекам, які...» «просьба лісты надсылаць», прышчапленьне слоўцаў—«артыста, бандыта, шэраг, альтанка» і інш., дык такая ўстаноўка, накіраванасьць пры апрацоўцы беларускае мовы на польскую мову (дзеля таго толькі, каб першая была па магчымасьці далей ад расійскае) стане зусім яснай.

І пара сказаць з усёй цьвёрдасьцю што **такое** установкі **Савецкай** Беларусі непатрэбна.

С.

ТЭАТР і КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
Пятніца 27 і субота 28 верасьня
толькі 2 канцэрты
Янны Іванаўны ЗАГОРСКАЙ
сьпевы народнасьцяй СССР.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА
Ад панядзелка 23 верасьня
Жывы труп
паводле драмы Л. ТАЛСТОГА.
Пачатак сэансаў а 7 г. увеч.
Каса—ад 5 гадз.
ЗВЫШ ПРАГРАММЫ
КІЧО-ХРОНІКА БЕЛДЗЯРЖКІНО:
ПЕРАВЫБАРЫ ДЭЛЕГАТАЎ.

КІНО Інтэрнацыянал
Ад панядзелка 23 верасьня
ВЕЧАР КАМЭДЫІ
1) Яна гэта ён у 3-х частк.
2) Ціхая сямейна у 3-х частк.
3) Цёмны канец у 2-х частк.
Пачатак 1 сэансу а 7 г. Каса—ад 5 г.

КІНО Пралетары
Ад панядзелка 23 верасьня
Адна з лепшых карцін сусьветнай кінэматографіі
ЧАНГ (ЖАХІ ДЖУНГЛЯЙ)

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"
Ад панядзелка 23 верасьня
Канец Санкт-Пецярбургу у 7 частк.
Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дня.
Пачатак 1-га сэансу а 3 г. 30 к., 2-га—а 5 г.
Цана білета 10 к. Месцы нумаравныя.

КІНО СПАРТАК
Ад аўторка 24 верасьня замежны баявік
ГІШПАНСКАЯ ТАНЦОРКА
у 8 частках.
З удзелам ПОЛІ НЭГРЫ.
Пачатак а 7 з пал. г. Каса—ад 5 з пал. г.

Курсы мастацкай машыннай вышыўкі
пры Менскім Інспэктарыяце Народнае асьветы.
—) АБВЯШЧАЕЦЦА (—
НОВЫ ПРЫЁМ ВУЧНЯЎ НА КУРСЫ
Тэрмін навучаньня 4 з пал. месяцы. Курсы існуюць на самаапладзе. Заявы прымаюцца з 25 верасьня па 1-ае кастрычніка штодня з 12 да 2 гадз. дня.
Аб умовах даведацца на курсах.
Адрас: Камуністычная 19—Дом Асьветы, пакой № 4.

АДКРЫТА ПРАДАЖА
АБАНІМЭНТНЫХ КНІЖАК
для кіно-тэатру „КУЛЬТУРА"
Абанім. кніжкі выпушчаюцца па цане 70 кап. за кожную.
Кніжкі падзяляюцца на 2 катэгорыі:
У абанім. кніжку 1-й катэгорыі уваходзяць: 4 білеты па цане 50 кап., 4—па 40 к. і 4—па 25 кап.
У абанім. кніжку 2-й катэгорыі ўваходзяць: 4 білеты па цане 35 кап., 4—па 25 к. і 4—па 20 кап.
Усяго ў кожнай кніжцы па 12 білетаў.
У кошт кніжкі (70 кап.) уваходзіць і папярэдняя аплата кожнага білету па 5 кап.
Пры пакупцы білетаў у касе тэатру абанэнтам даецца
СКІДКА:
Па кніжках 1-й катэгорыі білет цаною 50 кап. будзе прадавацца па 33 кап., цаною ў 40 к.—па 25 к., цаною ў 25 к.—па 15 к.
Па кніжках 2-й катэгорыі білет цаною 35 кап. будзе прадавацца па 20 кап. цаною ў 25 к.—па 15 к. цаною ў 20 к.—па 10 к.
Кніжка павінна быць поўнасьцю скарыстана ў працягу 4 месяцаў з дню яе набыцьця.
ПРОДАЖ АБАНІМЭНТНЫХ КНІЖАК адбываецца ў рабочай касе і па заяўках фабзаўмясцкомаў.
УВАГА! Для выгады абанэнтаў адкрыта папярэдняя прадажа білетаў ад 12 г. да 2 г. дня ў касе кіно „Культура" штодзенна.

ЗЬВЯЗДА
ФОТО-ЦЫНКАГРАФІЯ
ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ
НА КЛІШЭ
ШТРЫХОВЫЯ, ТОНАВЫЯ, СЕТКА і ПАЛУТОНЫ
МАСТАЦКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ РЫСУНКАЎ:
ПАРТРЭТЫ, ГРАВЮРЫ, ПЛЯНЫ, СХЭМЫ, ФАКСІМІЛЕ, ЭТЫКЭТЫ, ЦЭНЬНІКІ, ВОКЛАДКІ, ВІНЬЕТКІ, РЭКЛЯМНЫЯ ПЛЯКАТЫ і іншыя МАСТАЦКІЯ РАБОТЫ.
З ЗАКАЗАМІ ЗВАРОЧВАЦЦА У ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА"-МЕНСК, САВЕЦКАЯ, №63, 3ці ПАВЕРХ

ВЫШАЎ З ДРУКУ, РАССЫЛАЕЦЦА ПАДПІСЧЫКАМ І ПРАДАЕЦЦА Ў КНІГАРНЯХ
№ 6 (ЖНІВЕНЬСКІ) ЧАСОПІСІ
„УЗВЫШША"
ЗЬМЕСТ:
Пятро Глебка.—Трывожны сыгнал (поэма)
Кузьма Чорны.—3 драмы.
Язэп Пушча.—Бязбожны сын і інш. вершы.
Лявон Паэгле.—Хто адседзіць (апавяданьне)
Кяшторны.—Маці і інш. вершы
А. Мрый.—Запіскі Самсона Самасуя (аповесьць)
Максім Лужанін.—Словы без мэлёдыі (вершы)
Адам Бабарэка.—Узвышэнская поэзія
Проф. Вазьнасенокі.—Другі Беларускі Дзяржаўны Тэатр
Віт. Вольскі.—Цюрка-татарскія элемэнты ў беларускай мове
К.—Пра слова «Гурт».
Б. Папкоўскі.—Пра кніжку «Десять років Украінскай літературы»
«УЗВЫШША» прадаецца ва ўсіх кнігарнях БДаВ. Цана 80 кап. Яшчэ ня позна падпісацца на другое паўгодзьдзе. Ёсьць комплекты часопісі за першае паўгодзьдзе.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА" званоце па тел. 2-49

Для здачы АБВЕСТКІ ў газэту „ЗЬВЯЗДА" званоце па тел. 7-81

ПАДПІШЭЦЕСЯ ЗАГАДЗЯ НА КАСТРЫЧНІК І ДАЛЕЙШЫЯ ТЭРМІНЫ
НА ГАЗЭТУ
ЗЬВЯЗДА
орган ЦК і Мен. АК КП(б)Б.
УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—90к., на 3м.—2 р. 60к., на 6 м.—5 р., на 1 г.—9 р. 75 к.
«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льготных умовах часопісі
БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ 1 м.—20 к. (замест 35 к.)
Рабоче-Крэсьтьянскі КОРРЕСПОНДЭНТ 1 м.—25 к. (замест 30 к.)
ОГОНЕК 1 м.—25 к. (замест 40 к.)
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:
У Менску: Гал. к-рай газ. «Зьвязда», Савецкая, 63, яе ўпоўнаважанымі, адзд. «Известия» и «Правда», Беларускім газэтным бюро і газэтаносцамі.
Па акругах: Упоўнаважанымі газэты „Зьвязда", адзд. „Известия" і „Правда", кіёскамі к-ва Друку і ўсімі паштова-тэлеграфнымі канторамі.
СВАЯЧАСОВАЯ здача падпіскі ГАРАНТУЕ АКУРАТНУЮ І БЕСПЕРАПЫННУЮ ДАСТАЎКУ ГАЗЭТЫ.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакуманты

лічыць несапраўднымі

Згублен рэвольвэр сыст. «Браунінг» за № 28445. Просьба зьвярнуць па адрасе: Камунальная, 29, школа АБВШ т. Клубнікову.

Украдзены 11 ліпеня 1929 года пячатка і штамп Аршанскага Тубэркулёзнага Дыспансэра.

ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДНЫМІ

Руч.-конская картка № 919 Стройна К., выд. чавускім РВК. 867

Руч.-конская картка № 3551 Анісімава І., выд. чавуск. РВК. 868

Дапрызыўн. кніжка Краўчанка Г. Л., выд. нараўлянск. РВК. 869

Цл. паявая кніжка № 905 Вольфсон І. Е., выд. калінкавіцкім спажывецкім т-вам. 870

Членск. білет № 1-17295 Маскаліка С., выд. саюзам бу[illegible] даўнікоў. 871

Руч.-конская кніжка [illegible] Гарэліка І. Г., выд. [illegible] № 2364 [illegible] д. заслаўск. 872

Руч. конская кніжка № 990 Бучэлка А. М., выд. заслаўск. РВК. 8793

Цл.